

«УЧАСТКОВЫ – АМАЛЬ ШТО ПСІХОЛАГ»

ЧЫРВОНКА

НА ТРЫ ДНІ – У АМСТЭРДАМ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 СНЕЖНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 245 (28861)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:**

*«Спадзяюся, што ўсе гэтыя пытанні з Масквой па падатковым манеўры ў найбліжэйшы час будуць вырашаны. Наш аптымізм выцякае са справядлівасці аргументаў, якія выпрацаваны Міністэрствам фінансаў Беларусі, яны сапраўды дастаткова пераканаўчыя. Спадзяюся, што мы будзем вельмі аргументаваныя, і сваю пазіцыю зможам данесці».*

## КОРАТКА

- **Нацбанк прыняў рашэнне захаваць стаўку рэфінансавання на ўзроўні 10 %.**
- У Беларусі 37,6 % уведзенага ў студзені — лістападзе жылля пабудавана для маючых патрэбу.
- **ДАІ УУС Мінаблвыканкама нагадвае кіроўцам квадрацыклаў аб адміністрацыйнай адказнасці за язду па сельгасугоддзям.**
- Дзеці, якія з'явяцца на свет у радзільнях Мінска ў студзені 2019 года, атрымаюць наборы падарункаў.
- **МПЗ пакуль не будзе ініцыяваць узмацненне жорсткасці адказнасці для нелегальных таксістаў.**



- У Брэсце за спробу ўгону васьмі транспартных сродкаў затрымалі навучэнца прафесійнага ліцэя.
- **Браканьера на аленяў са штата Місуры (ЗША) па рашэнні суда прысудзілі да штомесячнага прагляду мультфільма «Бэмбі».**

MINSK 2019 2nd EUROPEAN GAMES

# Білеты для Лесіка



Фота БелТА.

**Учора стартаваў афлайн-продаж білетаў праз касы афіцыйнага білетнага аператара Гульняў, кампаніі «Тыкетпро».**

Першым пакупніком папяровых квіткоў стаў талісман II Еўрапейскіх гульняў — лісяня Лесік. Арганізатары адзначаюць, што адным з асноўных кірункаў падрыхтоўкі білетнай праграмы II Еўрапейскіх гульняў стала абарона ад падробак. Акрамя таго, што кожны білет — як электронны, так і папяровы, будзе абаронены ўнікальным штрых-кодам, пры вырабе папяровых версій выкарыстаны дадатковыя элементы абароны: 3D-галаграма, нанясенне спецыяльнага UV-чарніла і іншыя.

Нагадаем, пачынаючы з 1 снежня ўсе ахвотныя могуць набыць білеты на II Еўрапейскія гульні праз сайт www.minsk2019.ticketpro.by, а ў Еўропе — праз афіцыйных рэсэлераў. У Расійскай Федэрацыі білеты таксама ўжо паступілі ў продаж 15 снежня на сайце афіцыйнага білетнага агента www.ponominalu.ru.

Нагадаем, кошт квітка на спартыўныя спаборніцтвы вар'іруецца ад 5 рублёў або 2 еўра (для замежных грамадзян) да 50 рублёў або адпаведна 20 еўра. Кошт квіткоў на цырымонію адкрыцця складае ад 150 да 300 рублёў у залежнасці ад катэгорыі месца. Цэны білетаў на цырымонію закрыцця некалькі ніжэйшыя, іх кошт ад 70 да 150 рублёў. Агульная колькасць пасадачных месцаў на трыбунах падчас II Еўрапейскіх гульняў складзе 381 тысячу з магчымасцю павелічэння іх да 535 тысяч у залежнасці ад попыту і папулярнасці віду спорту.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

По сутнасці

# УСЕАГУЛЬНАЕ ПАЧЫНАЕЦЦА З МАЛОГА

**Размова з дэпутатамі аб заканадаўстве ў сферы правоў чалавека**

**Мерапрыемства, якое нядаўна прайшло ў Доме прэсы, можна назваць сваіго роду выязным пасяджэннем парламенцкай камісіі. Па ініцыятыве Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі і «Звязды» была зладжана сустрэча з нагоды 70-годдзя прыняцця Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, у якой прынялі ўдзел дэпутаты і прадстаўнікі нашай рэдакцыі. Адбылася зацікаўленая змястоўная гутарка, самымі адметнымі момантамі якой спяшаемся падзяліцца з чытачамі.**

СТАР. 4



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Пакупнікам на заметку

# Грошы за сертыфікаты вярнуць не будуць

## Як зменяцца правы спажыўцоў

**Змяненні ў закон «Аб абароне правоў спажыўцоў» уступаюць у сілу з 23 снежня. У Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю расказалі, пры якіх умовах можна будзе вярнуць тавары, ці варта разлічваць на рэшту з падарункавых сертыфікатаў і як змагацца з навязлівым сэрвісам.**

## Шрыфт нармальнага памеру

З улікам прапаноў спажыўцоў, у апісанні тавару будзе ўказвацца інфармацыя аб краіне паходжання (калі яна не супадае з адрасам вытворцы) і класе энергаэфектыўнасці (напрыклад, у маркіроўцы халадзільнікаў, пральных машын). Прадаўцы, якія рэалізуюць тавары дыстанцыйна праз рэкламу ці іншыя крыніцы (у тым ліку праз інтэрнэт), мусяць указваць цану шрыфтам, не меншым па памеры за палову найбольшага шрыфту ў апісанні.

Замацавалі права пакупніка разлічвацца гатоўкай ці ў безнаяўнай форме. Пры гэтым цана ў залежнасці ад формы аплаты не павінна адрознівацца.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

18245>

**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2019 года, — у падарунак 4 календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы**



Парламенцкі дзённік

# ПРЭЗУМПЦЫЯ ДОБРАСУМЛЕННАСЦІ

## Бюджэт-2019 і новую рэдакцыю Падатковага кодэкса прынялі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у другім чытанні

**Апошнія дні сесіі ніжняй палаты парламента выдаліся багатымі на навіны. Дэпутаты завяршылі работу над самымі актуальнымі законапраектамі, якія горача абмяркоўваліся, — Падатковым кодэксам і рэспубліканскім бюджэтам.**

— Такога роду дакумент (Падатковы кодэкс. — **Аўт.**) заўсёды гульня розумаў. Ёсць людзі, якія добрасумленна плацяць падаткі, а ёсць заўсёды і тыя, хто думае, як жа абысці гэта ў рамках закона на карысць сабе. Таму дакумент павінен быць з аднаго боку вельмі лёгкі і зразумелы для чытання, з другога — ён не павінен пакідаць шчыліны тым, хто можа яе шукаць, — пракаментаваў журналістам асаблівасці работы над кодэксам **дэпутат Валерый БАРАДЗЕНЯ.**

Сістэмныя меры новай рэдакцыі кодэкса прадугледжваюць наступныя навацыі. Уводзіцца «прэзумпцыя добрасумленнасці» — пакуль падатковы орган дакументальна не дакажа злачынства, плацельшчыка лічаць невінаватым. Зменены парадак прыпынення аперацый па рахунках — плацельшчыкам, якія мінулыя перыяды выконвалі абавязкі сумленна, будзе дадзены дадатковы час на аплату. Зблiжаны падатковы і бухгалтарскі ўлік. Прадугледжваецца экстэрытарыяльны прынцып абслугоўвання: фізічныя асобы могуць звяртацца ў любыя падатковыя органы, а не толькі па месцы жыхарства. Аптымізаваны парадак спагнання дэбіторскай запазычанасці. Памер пені за парушэнне не будзе перавышаць суму даналічанага падатку. Зніжаны стаўкі для фізічных асоб, якія інвестуюць у развіццё вытворчасці. Адменена стаўка падатку на нерухомасць 2 % у адносінах да аб'ектаў звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва. Рэалізавана прапанова аб адмене права мясцовых Саветаў дэпутатаў павышаць да 10 разоў стаўкі падаткаў на нерухомасць і зямельнага падатку на неэфектыўна выкарыстоўваемыя аб'екты.

Для паэтапнага рэфармавання падатковай сістэмы створаны Кансультацыйны савет, дзякуючы якому будзе забяспечаны дыялог дзяржаўных органаў і прадпрымальнікаў.

Падзяку за плённую працу над законапраектам дэпутатам выказаў міністр фінансаў Максім Ермаловіч.

Вызначыў кіраўнік ведамства і асаблівасці бюджэту-2019 у параўнанні з мінулымі.

— Сацыяльная накіраванасць бюджэту павялічана. Суадносна з даручэннем кіраўніка дзяржавы мы пачалі паэтапна зніжаць узровень падтрымкі рэальнага сектара эканомікі. За кошт эканоміі па гэтых кірунках мы аднаўляем частку сацыяльных расходаў, у першую чаргу заробкі, — сказаў Максім Ермаловіч. — У бягучым годзе мы прынялі рашэнне аб двухэтапным павелічэнні заробкаў. Такі ж крок зробім і ў будучым годзе ў некалькі меншым аб'ёме. У цэлым ацэньваем, што сярэдні заробак павялічыцца на 70 рублёў у параўнанні з бягучым годам у разліку на аднаго бюджэтніка ў месяц. У далейшым будзем працаваць па павышэнні заробкаў для нізкааплатнай катэгорыі бюджэтнікаў.

***

Учора ў верхняй палаце парламента было разгледжана 16 пытанняў. Сенатары абралі на пасады суддзяў Канстытуцыйнага Суда Леаніда Рабцава і Сяргея Чыгрынава. Ратыфікавалі шэсць міжнародных дакументаў, у тым ліку пагадненне аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і Кітайскай Народнай Рэспублікай.

«У нас значны рост тавараабароту з КНР, уключаючы наш экспарт, — паведаміў журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Сяргей РАХМАНАЎ.** — Кітайскі рынак велізарны па аб'ёме, таму ён вельмі важны і перспектыўны. Задача беларускага боку ў тым, каб узмацніць вытворчы складнік, ажыццявіць пэўную дыверсіфікацыю вытворчасці і экспарту. Ратыфікацыя пагаднення стане дадатковым стымулам для яе вырашэння».

Савет Рэспублікі таксама ратыфікаваў часовае пагадненне, якое вядзе да ўтварэння зоны свабоднага гандлю паміж ЕАЭС і Іранам. У гэта пагадненне ўключаны элементы, звязаныя са зніжэннем тарыфаў. Прычым у шэрагу выпадкаў гаворка ідзе аб кратным зніжэнні. Беларуская прадукцыя дзякуючы гэтаму становіцца канкурэнтаздольнай на іранскім рынку.

Акрамя таго, сенатары ўхвалілі законапраекты, якія датычацца гарантый насельніцтву ў атрыманні якаснай пітной вады, аўтамабільных дарог, пагранічнай бяспекі, рэгістра насельніцтва, адходаў, інвестыцый і прыватызацыі. Былі таксама падведзены вынікі міжпарламенцкай дзейнасці Савета Рэспублікі ў 2018 годзе.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Расіяне вызначылі топ-5 айчынных палітыкаў 2018 года



Кіраўнік расійскай дзяржавы Уладзімір Пуцін узначаліў рэйтынг айчынных палітыкаў 2018 года. Пра гэта сведчаць даныя апытання фонду «Грамадская думка». Адказваючы на пытанне «Каго з расійскіх палітыкаў, грамадскіх дзеячаў вы назвалі б чалавекам года?», 29 працэнтаў рэспандэнтаў назвалі прозвішча прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, перадае РІА «Навіны». Другое месца заняў міністр замежных спраў Сяргей Лаўроў, якому аддалі сваю перавагу сем працэнтаў удзельнікаў апытання. Замкнуў тройку лідараў з чатырма працэнтамі кіраўнік ЛДПР Уладзімір Жырыноўскі. У топ-5 палітыкаў 2018 года таксама ўвайшлі кіраўнік Міністэрства абароны РФ Сяргей Шайгу (тры працэнты) і дырэктар «Саўгаса імя Леніна» Павел Грудзінін (два працэнты). Пры гэтым 17 працэнтаў рэспандэнтаў прызналіся, што не бачаць у Расіі годных палітыкаў, а 34 працэнты не змаглі даць адказ.

### Французскія паліцэйскія патрабуюць павышэння зарплаты




У Францыі, дзе яшчэ не заціхлі пратэсты «жоўтых камізэлек», на арэну выходзяць «камізэлькі сінія», адзначае Euronews. Два прафсаюзы паліцэйскіх заклікалі сваіх актывістаў правесці двухдзённую забастоўку, выконваючы толькі мінімум абавязкаў да таго часу, пакуль іх прадстаўнікоў не прыме прэзідэнт рэспублікі Эмануэль Макрон. Пасля пяці тыдняў напружанай работы ў сувязі з маніфестацыямі па ўсёй краіне і тэрактам у Страсбуры прафсаюзы заяўляюць, што вартавыя парадку надзвычай знясіленыя і стаміліся, а таму патрабуюць паляпшэння ўмоў працы і павышэння заработнай платы. Раней кіраўнік МУС Францыі Крыстоф Кастанер прызнаў, што дзяржава за апошнія дзесяць гадоў завінавацілася паліцэйскім каля 275 мільёнаў еўра ў якасці аплаты звышурочнай працы. Надышоў час пагашаць даўгі. На гэтым фоне ўрад Францыі выступіў з прапановай выплаціць аднаразовую прыбаўку ў памеры 300 еўра да зарплаты паліцэйскіх.

### Ілан Маск паказаў першы высакаскорасны тунэль пад Лос-Анджэлесам



Ілан Маск паказаў першы падземны хуткасны тунэль, пабудаваны яго кампаніяй Boring Company. Прадпрымальнік прамчаўся па ім на аўтамабілі Tesla Model X. «Было проста выдатна, — расказаў ён журналістам пра свае адчуванні. — Для мяне гэта параўнальна з азарэннем, нешта накшталт «штука працуе». Узвядзенне тунэля пачалося больш за год таму. Упершыню Маск загаварыў пра яго ў канцы 2016-га. Тунэль пачынаецца пад галаўным офісам кампаніі SpaceX у каліфарнійскім горадзе Хотарн і заканчваецца ў прыгарадзе Лос-Анджэлеса. Яго даўжыня складае амаль два кіламетры. Па словах Маска, узвядзенне канструкцыі абышлося яму ў 10 мільёнаў долараў. Для параўнання, кошт мілі тунэля, пракладзенага традыцыйнымі спосабамі, складае, па словах бізнесмена, да аднаго мільярда долараў. Мяркуецца, што па гэтым і будучых тунэлях будуць ездзіць электрычныя капсулы на аўтапілоце, якія змогуць перавозіць ад 8 да 16 пасажыраў з хуткасцю 200—250 кіламетраў у гадзіну. Паводле задумы інжынераў, спецыяльныя капсулы з пасажырамі будуць спускаць у тунэль на платформе непасрэдна з вуліцы. Падчас сваёй прэзентацыі Маск назваў высакаскорасныя тунэлі панацэяй ад перагружаных дарог. Ён лічыць, што ў будучыні іх удасца інтэграваць у гарадскія транспартныя сістэмы, каб паскорыць і спрасціць рух. Маск спадзяецца, што сеткі такіх тунэляў з'явяцца ў іншых буйных мегаполісах, у прыватнасці ў Чыкага і Вашынгтоне.

Ва ўрадзе

# Адзнака за працу

**Прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС уручыў дзяржаўныя ўзнагароды найлепшым прадстаўнікам працоўных калектываў. Ён адзначыў, што кожны ўнёс свой уклад у развіццё краіны.**

«Ужо сёння магчыма канстатаваць, што сумеснымі намаганнямі нам удалося дабіцца пэўных вынікаў. Збалансаваны знешні гандаль, палепшаны плацежны баланс краіны. Інфляцыя знаходзіцца ў запланаваных параметрах, і па выніках года мы чакаем рэкордна нізкае яе значэнне. Пры гэтым забяспечана стабільнасць на спажывецкім рынку. Асаблівая ўвага ў нашай краіне традыцыйна аддаецца аграпрамысловаму комплексу і заслужаныя ўзнагароды сёння ўручаюцца многім працаўнікам вёскі і работнікам прадпрыемстваў перапрацоўчай прамысловасці. Дзякуючы ім поўнасцю забяспечана харчовая бяспека нашай краіны. Высокая якасць выпускаемай прадукцыі, выкарыстанне натуральных прадуктаў і сыравіны дазваляюць вытворцам займаць вядучыя пазіцыі на сусветным рынку. І гэта не проста словы. Па прагнозах урада, экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі сёлета перавысіць узровень мінулага года і складзе каля пяці мільярдаў долараў ЗША. У наступным годзе мы таксама чакаем рост яшчэ на 7 %», — сказаў кіраўнік урада.

Сяргей Румас узнагародзіў дарожных рабочых, настаўнікаў, медыкаў, прадстаўнікоў іншых прафесій. Ён падкрэсліў: «Сярод узнагароджаных асабліва хочацца адзначыць Віталя Цітова і Алену Бурсаву. Пра такіх, як Віталь, кажуць: герой нашага часу. Ён, рызыкуючы сваім жыццём, 27 кастрычніка мінулага года выратаваў хлопчыка, які тануў у Свіслачы. Учынак сапраўднага мужчыны і грамадзяніна. Алена Бурсава сваімі прафесійнымі дзеяннямі садзейнічала затрыманню ўзброенага злачынца».

**Надзея АНІСОВІЧ.**

Супрацоўніцтва

# ПАДАРУНАК МУЗЕЮ

## Намаганнямі пасольства Беларусі ў Швейцарыі карціна Міхаіла Кікоіна папоўніла калекцыю Нацыянальнага мастацкага музея

**«Нацюрморт» — першы твор ураджэнца Гомельшчыны, прадстаўніка Парыжскай школы, сярод экспанатаў галоўнага мастацкага музея Беларусі. Вяртанне спадчыны, рэактуалізацыя імёнаў мастакоў XX стагоддзя — сёння адна з задач гэтай установы культуры.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

— «Нацюрморт» працягвае слынную традыцыю вяртання пры падтрымцы нашых дыпламатаў у культурны кантэкст Беларусі імёнаў выдатных суайчыннікаў, якія апынуліся ў замежжы. Дзякуючы падтрымцы такіх сяброў Беларусі, як ганаровы консул нашай краіны ў Лазане Андрэй Нажэскін, адбываецца сённяшняя падзея, — сказаў **намеснік міністра замежных спраў Беларусі Алег КРАЎЧАНКА.** — Хачу, безумоўна, адзначыць актыўную работу беларускага пасольства ў Швейцарыі, а таксама падзякаваць Нацыянальнаму мастацкаму музею Беларусі за ўзорнае супрацоўніцтва.

Апошнім часам нашы дыпламаты ў замежных краінах плённа працуюць па знаходжанні беларускай спадчыны.

— Справа вяртання нацыянальнай культуры мне бачыцца як нацыянальны праект, — адзначыў **Павел МАЦУКЕВІЧ, часовы павераны ў справах Рэспублікі Беларусь у Швейцарскай Канфедэрацыі.**

Творы Міхаіла Кікоіна знаходзяцца ў прыватных зборах і музеях Францыі, ЗША, Японіі і іншых краін свету. У Беларусі пяць яго палотнаў прадстаўлены ў карпаратыўнай калекцыі «Белгазпрамбанка» і ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў нашай краіны.

У цырымоніі перадачы ўдзельнічалі прадстаўнікі з Федэральнага дэпартамента замежных спраў Швейцарыі і кіраўнік дэлегацыі, намеснік дзяржаўнага сакратара Крысціна Марці Ланг. Швейцарскія дыпламаты завіталі ў Мінск з нагоды чарговага раўнда палітычных кансультацый у МЗС. У той жа дзень Алег Краўчанка і Крысціна Марці Ланг прынялі ўдзел у сумесным мерапрыемстве з Еўрапейскім інстытутам міру па тэматыцы медыяцыі і прэвентыўнай дыпламатыі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# СТАРТ ДЛЯ БУДУЧЫХ ПЕРАМОГ

## Названыя новыя стыпендыяты Прэзідэнцкага спартыўнага клуба

**У іх лік трапілі маладыя спартсмены (да 25 гадоў), якія на працягу года змаглі аказацца ў васьмёрцы найлепшых на міжнародных спаборніцтвах, а таксама найбольш паспяховыя трэнеры-выкладчыкі.**



Усяго сёлета стыпендыю Прэзідэнцкага спартыўнага клуба атрымаюць 253 чалавекі: 209 спартсменаў і 44 трэнеры, гэта прадстаўнікі 35 відаў спорту.

*— Спартсмены сёння атрымаюць свае заслужаныя стыпендыі, пераважная большасць гэтых атлетаў ужо паспелі пабываць на п'едэсталах сусветных і еўрапейскіх спаборніцтваў у сваіх узростах,* — адзначыў **старшыня Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый ЛУКАШЭНКА.** — *Спадзяёмся, на гэтым вы не спыніцеся, і гэтыя поспехі стануць адпраўным пунктам у вашай спартыўнай кар'еры, а не вяршыняй. Мы не сумняваемся, што вы самастойна ставіце перад сабой высокія мэты. Вядома, для вашага прагрэсу неабходна добрая дапамога, гэтым можа стаць стыпендыя Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Для рэалізацыі таленту трэба не толькі ўпарта трэніравацца, але і правільна размяркоўваць гэтыя рэсурсы. Ваш прагрэс і будучы поспех стане ацэнкай не толькі вашых вынікаў, але і нашай работы, памятайце, акрамя стыпендыі ў вас укладаюць старанне яшчэ трэнеры і родныя.*

Дарэчы, 67 спартсменаў будуць стыпендыятамі другі год запар. Толькі 13 з іх пагоршылі свае вынікі адносна мінулага года. А вось Яна Шут (більярд), Уладзіслаў Зарубіцкі і Вольга Бадэлька (абодва — шахматы) сталі стыпендыятамі клуба ўжо пяты год запар. Сярод спартсменаў, якія ў 2019 годзе атрымаюць фінансавую падтрымку, ужо ёсць, хоць юныя, але вядомыя атлеты, напрыклад, плыўчыха Настасся Шкурдай, баскетбалісткі Ганна Лапо і Настасся Сушчык, гімнаст Святаслаў Драніцкі і мастацкая гімнастка Ганна Каменшчыкава, дзюдаіст Арцём Коласаў і іншыя.

*— Мне прыемна знаходзіцца ў гэтай атмасферы, прадстаўлены спартсмены з 35 відаў спорту, гэта вельмі шмат, прыемна, што столькі відаў спорту дынамічна развіваецца ў нашай краіне,* — падкрэсліў **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК.** — *253 стыпендыяты — гэта таксама вельмі шмат, галоўнае, каб яны перайшлі годна ў дарослы спорт, як многія ўжо паспяхова гэта робяць. Спорт — гэта вялікая праца, таму жадаю вам сіл і цярпення. Дзякуй арганізатарам, цырымонія ўручэння стыпендый праходзіць ужо 13-ы раз. Неабходна падтрымліваць таленавітых людзей, калі мы разам будзем працаваць, мы дасягнём выніку, для нас ён сёння вельмі важны.*

Самая вялікая прызначаная стыпендыя на 2019 год — 14 000 рублёў. Мінімальная прызначаная гадавая стыпендыя — 2000 рублёў. Сярэдняя гадавая стыпендыя на 2019 год складае 7487 рублёў. Калі спартсмен быў стыпендыятам у гэтым годзе і паказаў вынік, які дазваляе прэтэндаваць на стыпендыю ў наступным годзе, то яго стыпендыя можа павялічыцца на 10 %, калі спартсмен паказаў аналагічны вынік — і на 20 %, калі дамогся прагрэсу. Трэнеры-выкладчыкі атрымаюць аднолькавую стыпендыю, якая прыкладна адпавядае значэнню сярэдняй стыпендыі спартсменаў на год, — 8000 рублёў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# Грошы за сертыфікаты...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прадаўцу забаронена патрабаваць у вас пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу, пры вяртанні вам грошай. Спажывец зможа таксама адмаўляцца ад дагавора аб выкананні работ (паслуг) у аднакавым парадку — пры ўмове аплаты выканаўцу фактычна панесеных выдаткаў.

Некаторыя нормы з'явіліся з улікам прапаноў бізнесу. Так, замяняць ці вярнуць тэхнічна складаныя і дарагія тавары праз 30 дзён пасля пакупкі і пазней можна будзе толькі ў двух выпадках: калі ёсць істотны недахоп ці прадавец парушыў тэрміны бясплатнага рамонту. А якасны тавар неабходна будзе вяртаць ва ўпакоўцы, у якой вы яго набылі.

Тэрмін гарантыйнага рамонту можа быць павялічаны з 14 да 30 дзён, але толькі з пісьмовай згоды спажыўца. Калі праз два месяцы пасля экспертызы ці бясплатнага рамонту вы так і не прыйшлі па сваю рэч (без уважлівай прычыны), з вас маюць права спагнаць выдаткі за яе захоўванне.

## Тавары ў падарунак

Крамы (у тым ліку інтэрнэт-гандляры) павінны будуць паведамляць пра змены ў рэжыме работы не пазней, чым за пяць дзён. Гэта прадугледжана праектам пастановы, распрацаваным міністэрствам. Калі работа прыпынілася па прадпісанні кантрольных органаў ці з тэхнічных прычын, якія не залежаць ад прадаўца (стаў працякаць дах, напрыклад), праінфармаваць пакупнікоў трэба неадкладна — аб'явай на самой краме ці на сайце.

На разглядзе ва ўрадзе цяпер знаходзіцца праект палажэння аб рэалізацыі тавараў, работ і паслуг па падарункавых сертыфікатах.

— Да сёння гэта пытанне амаль не рэгулявалася, на практыцы ўзнікала шмат спрэчных момантаў, — пакрэсліла **начальнік упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай МАРГ Іна ГАЎРЫЛЬЧЫК** у прэс-цэнтры БелТА. — На жаль, мы сутыкаліся з выпадкамі, калі па рашэнні прадаўца быў зменены тэрмін дзеяння сертыфіката, хоць у самім дакуменце нічога не было ўказана.

Новыя правілы ўлічваюць такія моманты: крамы не будуць мець права ўстанаўліваць умовы, якія скарачаюць перыяд дзеяння сертыфіката ці патрабуюць дадатковых дзеянняў для яго рэалізацыі.

Раней міністэрства анансавала, што падарункавы дакумент можна будзе здаць і вярнуць грошы ці атрымаць рэшту, калі яго наміналы кошт большы за суму тавараў, якія хочаш набыць. Але гэтыя нормы ў выніку не ўключылі ў палажэнне. Адзінае — прадаўцоў абавяжуць забяспечваць шырокі асартымент, каб пакупніку было на што патраціць сертыфікат.

— У спажыўца ёсць альтэрнатыва — падарыць грошы або сертыфікат. Таму тройчы падумайце, што лепш выбраць, — дадае **Ірына БАРЫШНІКАВА, намеснік начальніка ўпраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай МАРГ.**

## Не плаціце шантажыстам

Што будзе з прадаўцамі, якія зазываюць на прэзентацыі каструль і пасцельнай бялізны? Асобнай нормы для іх у абноўленым законе не прапісана. Абараніць ад навязлівага сэрвісу пакупнік мусіць сябе сам.

— Не трэба адчуваць сябе абавязаным набыць тавар, нават калі вам на прэзентацыі ўручылі падарунак, — кажа Іна Гаўрыльчык. — Асабліва звяртаем увагу пажылых людзей: абавязкова параіцеся з дзецьмі, суседзямі. Не купляйце адразу. Трэба сувымяраць свае даходы: ці зможаце вы кожны месяц выплачваць у растэрміноўку істотную суму? Рэкамендуем як мага больш інфармацыі даведацца аб прадаўцу і тавары. Трывожны званок — калі вам гэтыя звесткі не даюць. Неабходна не толькі слухаць прадаўца, але і чытаць, што на ўпакоўцы. Калі інфармацыя ёсць толькі на англійскай мове, лічыцца, што яна не даведзена да пакупніка — патрабуйце на рускай ці беларускай.

Што да камерцыйных структур, якія пад выглядам таварыстваў абароны правоў спажыўцоў шантажыруюць прадаўцоў, то зменаў у рэгуляванні іх дзейнасці таксама не прадугледжана.

— Гэтыя арганізацыі зарэгістраваныя як юрыдычныя асобы, што ажыццяўляюць адукацыйныя паслугі. Яны ходзяць па крамах, праводзяць праверкі, запалохваюць і прымушаюць адпраўляць супрацоўнікаў на курсы. Дзейнасць гэта прыбытковая, таму такіх фірмаў хапае: пару гадоў таму мы налічылі іх больш за 20, — каментуюць у міністэрстве. — Адзіная рэкамендацыя прадаўцам — не плаціць вымагальнікам. Не парушайце закон, тады і не будзе падстаў вас шантажыраваць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

Чулі?!

# Змяняецца парадак выдачы бальнічных

**У Беларусі ўнесены змяненні ў парадак афармлення лістоў непрацаздольнасці і даведак аб часовай непрацаздольнасці. Новаўвядзенні пачнуць дзейнічаць з 31 студзеня 2019 года.**

Змяненні датычацца як парадку выдачы дакументаў, якія сведчаць пра часовую непрацаздольнасць (лістка непрацаздольнасці і даведкі аб часовай непрацаздольнасці), так і парадку афармлення гэтых дакументаў з улікам практыкі прымянення, адзначылі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя.

Такім чынам, у сувязі з пераходам на афармленне бальнічных у форме электроннага дакумента ўстаноўлены новыя формы гэтых дакументаў і парадак іх афармлення. Разам з тым бланкі лісткоў непрацаздольнасці (даведак аб часовай непрацаздольнасці), якія былі выпушчаны да ўступлення ў сілу новаўвядзенняў, будуць сапраўдныя да поўнага іх выкарыстання на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Аптымізавана і ўніфікавана інфармацыя, якую неабходна ўказваць пры афармленні лістка непрацаздольнасці.

Таксама ўдакладнена кола асоб, якім выдаецца лісток непрацаздольнасці і даведка аб часовай непрацаздольнасці. Асобам працаздольнага ўзросту, якія не працуюць і не стаяць на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў якасці беспрацоўных, будзе выдавацца даведка аб часовай непрацаздольнасці. Яе выдача прадугледжана і асобам, якія даглядаюць інваліда I групы, — у выпадку стацыянарнага лячэння асобы, якая фактычна даглядае інваліда I групы.

Вызначаны парадак выдачы лістка непрацаздольнасці па доглядзе хворага дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку, калі маці ці асоба, якая фактычна даглядае дзіця, адначасова працуе на ўмовах няпоўнага рабочага часу (не больш за палову месячнай нормы гадзін) ці дома, або вучыцца. У такім выпадку лісток непрацаздольнасці па доглядзе хворага дзіцяці выдаецца толькі маці ці асобе, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці. Пры гэтым прадугледжана магчымасць выдачы даведкі аб часовай непрацаздольнасці іншай асобе па доглядзе за хворым дзіцем да 3 гадоў (дзіцем-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў). У выпадку хваробы маці, якая даглядае дзіця ва ўзросце да 3 гадоў, падчас выдачы ёй лістка непрацаздольнасці не патрэбна пацвярджэнне аб наведванні дзіцем дзіцячага садка.

Таксама новаўвядзенні прадугледжваюць магчымасць падаўжэння лістка непрацаздольнасці асобе, якая даглядае хворае дзіця ва ўзросце да 14 гадоў (дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў) пры аказанні яму медыцынскай дапамогі ў стацыянары, на адзін дзень для праезду да месца жыхарства ў сувязі з аддаленасцю арганізацыі аховы здароўя і немагчымасцю ў дзень выпіскі даехаць да месца жыхарства.

Удакладнілі інфармацыю, якая павінна быць у медыцынскіх дакументах («Медыцынскай даведцы аб стане здароўя» і «Выпісцы з медыцынскіх дакументаў») пры звароце пацыента па медыцынскую дапамогу ў сувязі з немагчымасцю выконваць (працягваць) работу (службу, вучобу) ці ажыццяўляць догляд за дзіцем да 3 гадоў у арганізацыю аховы здароўя, што аказвае хуткую медыцынскую дапамогу, у тым ліку і ў бальнічную арганізацыю. Гэта інфармацыя аб даце, часе звароту пацыента па медыцынскую дапамогу, даныя аб'ектыўнага медыцынскага агляду і вынікі праведзеных абследаванняў. Такія звесткі неабходны ў выпадку правядзення экспертызы часовай непрацаздольнасці.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Не прапусціце!

## Спытайце пра радзіннае

Як і абяцалі, ужо з новага года мы вяртаем на старонкі «Звязды» вельмі папулярную ў свой час у нашых чытачоў рубрыку «Радзіннае», якую, як і раней, будуць весці даследчыкі народнай культуры Аксана КАТОВІЧ і Янка КРУК. Праўда, гэтым разам рубрыка памяняе свой фармат: яна цалкам будзе пабудавана на пытаннях-адказах. Нашы аўтары шмат ездзяць па ўсіх рэгіёнах Беларусі, у іх у запасе шмат пытанняў, якія ім задавалі на сустрэчах, і адказаў на іх. Але мы спадзяёмся, што нашы чытачы таксама актыўна далучацца да цікаўных.

**Калі вы хочаце ведаць падрабязнасці і сэнс таго ці іншага сямейнага абраду (датычыцца ён нараджэння дзіцяці, вяселля ці пахавання), калі цікавіцеся традыцыйнымі святамі беларусаў і хочаце адзначаць іх па правілах, калі прычыніліся да нейкага незвычайнага дзейства старэйшых сваякоў, але ніхто не можа растлумачыць яго сэнсу, — пішыце нам на паштовы або на электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».**

Адказы і тлумачэнні знойдуцца хутка — ужо ў наступным годзе. І канешне, пры ўмове, што аформіце падпіску на «Звязду» — інакш як вы іх прачытаеце?

Пішыце нам, заставайцеся з намі — будзе цікава!

**Шчырыя спачуванні Мікалаю Зігулю, яго сынам Аляксандру і Міхаілу і іх сем'ям, унукам з нагоды раптоўнай і заўчаснай страты жонкі, маці, бабулі — Ніны Іванаўны ЗІГУЛІ. Спачуваем, смуткуем, памятаем. Родныя.**

# УСЕАГУЛЬНАЕ ПАЧЫНАЕЦЦА З МАЛОГА


Андрэй НАВУМОВІЧ.


Павел СУХАРУКАЎ.


Валянціна РАЖАНЕЦ.


Валерый САЎКО.


Васілій БАРАНІК.

## У духу братэрства

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Андрэй НАВУМОВІЧ** на пачатку размовы падкрэсліў: «У канцы 2016 года ў нашай краіне быў прыняты Нацыянальны план па правах чалавека, і, як заявіў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, гэта стала найважнейшым элементам сістэмнага забеспячэння ўсяго комплексу правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь».

«Адносіны да сваіх правоў у кожнага чалавека свае, і гэта нармальна, бо свет цудоўны сваёй разнастайнасцю», — заўважыў **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ**. «Але існуе стэрэатып, што правы чалавека — гэта вузкая рэч, яна датычыцца пытанняў, якія звязаны перш за ўсё з палітычнымі працэсамі. А ўсё астатняе — рэчы малазначныя, — сказаў ён. — У нас усе жадаюць выратаваць свет, але ў англійскай мове ёсць цудоўны выраз «think globally act locally», які можна перафразаваць так: «думай пра выратаванне сусвету, але выратуй свайго бліжняга».

**«Мы шануем свае правы і правы іншых. Беларусь — міралюбівая краіна, якая імкнецца захоўваць правы суседзяў, з'яўляецца пляцоўкай для ўрэгулявання многіх канфліктаў».**

Павел Сухарукаў таксама нагадаў вядомае выказванне пра тое, што свабода аднаго чалавека заканчваецца там, дзе пачынаецца свабода іншага. «У нас правы чалавека, які побач, — гэта часта толькі яго праблемы. Маўляў, мае правы павінны захоўвацца ў першую чаргу, а ўсё астатняе — пастолькі, паколькі, — дадаў ён. — Пакуль кожны не пачне ставіцца да правоў іншага чалавека гэтак жа, як адчувае патрэбу ў забеспячэнні сваіх уласных правоў, будуць узнікаць праблемы».

## Правы на абарону

Калі казаць пра дзейнасць парламента, то сваю задачу дэпутаты бачаць ва ўдасканаленні правоў чалавека ў нашай краіне праз стварэнне адпаведных законаў. Гэта і ўмацаванне гарантый дзяржаўнай падтрымкі найменш абароненых катэгорый грамадзян. І ўдасканаленне заканадаўства ў сферах ахоўы здароўя, фізічнай культуры і спорту. І далейшае развіццё маладзёжнай, сямейнай палітыкі. І забеспячэнне дэмаграфічнай бяспекі, і многае іншае.

У свой час Пастаянная камісія па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі падрыхтавала да разгляду закон, мэта якога — абарона дзяцей ад інфармацыі, што наносіць шкоду іх здароўю і развіццю. Ён уступіў у сілу 1 ліпеня 2017 года. Таксама адказвала за падрыхтоўку закона аб унясенні змяненняў у некаторыя законы па пытаннях дзейнасці палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Важнасць сацыяльнай місіі такіх арганізацый бясспрэчная: гэта своеасаблівае злучальнае звяно паміж органамі ўлады і грамадствам.

З апошніх заканадаўчых змяненняў можна адзначыць: усталяванне паведамляльнага парадку правядзення масавых мерапрыемстваў; увядзенне апеляцыі ў грамадзянскім судаводстве; павышэнне ўзроўню абароненасці ад негатыўнага ўплыву інтэрнэту, у прыватнасці, абарону правоў дзяцей, барацьбу з незаконным распаўсюджваннем асабістых даных, умацаванне нацыянальнай інфармацыйнай прасторы; увядзенне інстытута абавязковага публічнага абмеркавання для законапраектаў, якія закранаюць правы, свабоды і абавязкі грамадзян.

«Прынятыя на мінулай сесіі законы аб сродках масавай інфармацыі і масавых мерапрыемствах непасрэдным чынам закранаюць правы чалавека, — сказаў Андрэй Навумовіч. — І пры рабоце над імі мы рабілі акцэнт на захаванні стабільнасці, якая сёння ёсць у нашай краіне. Нам патрэбны законы, якія гэта забяспечваюць».

Але стабільнасць не трэба разумець як нейкую застылую субстанцыю, удакладніла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Валянціна РАЖАНЕЦ**. «Стабільнасць спрыяе развіццю, без яе не будзе і руху наперад. Таму гэта вельмі важна», — аргументавала яна.

## Правы на парадак

За сем дзесяцігоддзяў значэнне Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека не становіцца менш актуальным. «Ведаючы свае правы, трэба навучыцца шанаваць і правы тых, хто побач, — лічыць Валянціна Ражанец. — Трэба таксама ведаць і выконваць свае абавязкі. Тады і праблем будзе менш».

Дэпутат удзельнічала ў прэзентацыі Дэкларацыі правоў чалавека, выдадзенай на беларускай мове, дзе таксама прагучалі думкі пра тое, што ў некаторых куточках свету яшчэ ёсць голад і пакуты ад адсутнасці элементарных умоў для жыцця.

«Мы жывём у цывілізаваным свеце, шануем свае правы і правы іншых. Беларусь — міралюбівая краіна, якая імкнецца захоўваць правы суседзяў, з'яўляецца пляцоўкай для ўрэгулявання многіх канфліктаў», — нагадала Валянціна Ражанец.

Андрэй Навумовіч расказаў, што некаторыя міжнародныя эксперты, якія працуюць з нашымі парламентарыямі па праблематыцы смяротнага пакарання, пасля знаёмства з краінай выказваюць жаданне нават застацца тут і жыць, бо сустракаюць у Беларусі тое, чаго не хапае зараз многім краінам свету: бяспеку і камфорт.

Гэта датычыцца і правядзення масавых мерапрыемстваў. «Нядаўняе абнаўленне заканадаўства ў сферы правядзення масавых мерапрыемстваў накіравана на далейшае ўдасканаленне прававой базы, якая адпавядае сусветным стандартам арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў і сучасным патрабаванням бяспекі, — лічыць **дэпутат Валерый САЎКО**. — Сёння многія дзяржавы і ў цэлым міжнародная супольнасць сутыкаюцца з нарастаючымі пагрозамі розных формаў экстрэмізму, уключаючы тэрарызм, здольных прывесці да масавай гібелі людзей, дэстабілізацыі абстаноўкі не толькі ў асобнай дзяржаве, але і ў свеце».

Гэта нельга не ўлічваць пры падрыхтоўцы і правядзенні масавых мерапрыемстваў. Такім чынам узнікае няпростая задача пошуку балансу: з аднаго боку — гарантаваць рэалізацыю права на мірныя сходы, з другога — забяспечыць бяспеку як саміх удзельнікаў масавых мерапрыемстваў, так і іншых асоб.

Нормы праекта абмяркоўваліся на дзвюх сустрэчах з кіраўніком прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза і часовым паверaным у справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь. Праведзены шэраг пасяджэнняў рабочай групы, у тым ліку пашыранае пасяджэнне з удзелам прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый «Белая Русь», БРСМ, «Беларускі Хельсінкскі камітэт», «Беларуская асацыяцыя журналістаў», кампаніі «Гавары праўду», асветніцкай установы «Цэнтр прававой трансфармацыі», Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і іншых.

«Зараз мы працуем над падрыхтоўкай праекта закона «Аб змяненні законаў Рэспублікі Беларусь па пытанні ўзмацнення барацьбы з прапагандай нацызму і экстрэмізму», — дадаў Валерый Саўко. — З горыччу даводзіцца гаварыць пра тое, што ў XXI стагоддзі ў многіх краінах свету неафашызм становіцца палітычнай рэальнасцю».

У цяперашні час і ў нашай краіне мае месца развіццё ідэі вельмі правага толку, фіксуюцца факты скажэння мінулага, у інтэрнэце публікуюцца артыкулы, якія апраўдваюць фашысцкіх злачынцаў і іх памагатых, беспардонна фальсіфікуецца гісторыя, паведаміў дэпутат.

Усё гэта, па-першае, з'яўляецца цынічным здзекам з памяці мільёнаў ахвяр Другой сусветнай вайны, а, па-другое, нясе ў сабе пэўную патэнцыйную пагрозу нацыянальнай бяспекі нашай дзяржавы, лічыць ён.

Дэпутат Адам Кавалька прымаў удзел у другім форуме па пытаннях правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права «Парламенты — змагары за правы чалавека, дэмакратыю і вяршэнства права» ў Жэневе (Швейцарская Канфедэрацыя).

У рамках форуму быў падтрыманы пасыл прадстаўнікоў Дзяржаўнай Думы Расійскай Федэрацыі аб тым, што правы чалавека не павінны разглядацца ў адрыве ад культурнай, рэлігійнай, гістарычнай і ў цэлым — канстытуцыйнай ідэнтычнасці дзяржаў.

Дэлегацыя Беларусі ўдзельнічала ў дыскусіях і сустрэчах. У прыватнасці, у ходзе панэльнай дыскусіі, прысвечанай ролі парламентаў у прасоўванні правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права, было расказана аб вопыце парламента Беларусі ў распрацоўцы і ўдасканаленні заканадаўства ў галіне правоў чалавека, у тым ліку ў рамках ажыццяўлення мерапрыемстваў Нацыянальнага плана дзеянняў па правах чалавека.

## Права на жыццё

Што датычыцца прымянення ў краіне смяротнага пакарання, то Беларусь ідзе да яго адмены сваім шляхам і са сваёй хуткасцю, паўтарыў вядомы тэзіс Андрэй Навумовіч.

«Рэдакцыя Крымінальнага кодэкса 1999 года больш чым удвая скараціла колькасць складаў злачынстваў, за якія прадугледжваецца смяротнае пакаранне, — нагадаў ён. — Пашыраны пералік асоб, якім такое пакаранне не можа быць прызначана: акрамя непаўналетніх і жанчын гэта яшчэ мужчыны, якія дасягнулі да дня вынясення прысуду 65 гадоў».

Ні ў адным артыкуле Крымінальнага кодэкса смяротнае пакаранне не прадугледжана як адзінае магчымае. За апошнія 20 гадоў колькасць асоб, якім была прызначана выключная мера, скарацілася ў разы, паведаміў Андрэй Навумовіч.

**«Пры рабоце над гэтымі законапраектамі мы рабілі акцэнт на захаванні стабільнасці, якая сёння ёсць у нашай краіны. Нам патрэбны законы, якія гэта забяспечваюць».**

«Восем гадоў таму ў беларускім парламенце была створана рабочая група па вывучэнні праблематыкі смяротнага пакарання, — расказаў ён. — Вынікі работы гэтай групы знаходзяць адлюстраванне ў заканадаўстве. У 2015 годзе ў нашай краіне быў уведзены інстытут дасудовага пагаднення: калі абвінавачаны выканаў усе абавязацельствы, якія прадугледжвае такое пагадненне, выключная мера не выкарыстоўваецца. У 2016 годзе смяротнае пакаранне выключана з санкцыі артыкула «Здрада дзяржаве», а таксама замацаваны дадатковыя гарантыі асоб, якія асуджаны да выключнай меры, у рамках працэдур апеляцыйнага абскарджання».

Цяпер парламенцкая група праводзіць шырокую работу ў грамадстве: лекцыі, канферэнцыі, сустрэчы, круглыя сталы, выступленні ў СМІ.

«Беларусь «чуе» заклікі міжнароднай супольнасці да адмены смяротнага пакарання, і мы паступова прыйдзем да рашэння гэтай праблемы», — яшчэ раз працытаваў кіраўніка дзяржавы старшыня парламенцкай камісіі.

## Права на свабоду сумлення

У Беларусі на пачатак гэтага года зарэгістравана 25 канфесій і кірункаў, 3532 рэлігійныя арганізацыі і 193 нацыянальна-культурныя грамадскія аб'яднанні, праінфармаваў **дэпутат Васілій БАРАНІК**.

«Дзяржава не перакладае на рэлігійныя аб'яднанні свае функцыі і не ўмешваецца ў іх дзейнасць, але трымае руку на пульсе і ведае, у якім кірунку яны развіваюцца, — лічыць ён. — Узаемадзеянне ажыццяўляецца ў сацыяльнай сферы. І калі сярэдні ўзрост вернікаў расце, то ўдзельнікі нацыянальна-культурных аб'яднанняў у большасці — моладзь».

Васілій Баранік звярнуў увагу, што ў Беларусі не выкарыстоўваецца тэрмін «нацыянальная меншасць». Дзяржаўная палітыка ў гэтай сферы накіравана на свабоднае развіццё культур, моў, традыцый усіх нацыянальных супольнасцяў, поўную роўнасць, шанаванне і ўлік іх правоў і інтарэсаў, а таксама падтрымку ў рэалізацыі гэтых правоў. Сімвалам такой палітыкі стаў фестываль нацыянальных культур, які раз у два гады праводзіцца ў Гродне.

Яшчэ адзін значны кірунак дзейнасць парламента — работа са зваротамі выбаршчыкаў. Акрамя сустрэч у акругах, гэта яшчэ і прыём грамадзян у Палаце прадстаўнікоў. За мінулы год у Пастаянную камісію па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі паступіла 135 пісьмовых зваротаў, 18 вусных, сёлета — 147 пісьмовых і 10 вусных. Работа з гэтымі зваротамі вядзецца сістэмная і ўважлівая, запэўнілі народныя выбраннікі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
20 СНЕЖНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 24 (15855)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Іван БРЫНЗА:

# «ІДЭАЛЬНЫ ДЗЕНЬ — ТРЭНІРОВАЧНЫ»



**Ён сёлета нечакана, у тым ліку для самога сябе, стаў сярэбраным прызёрам юнацкага чэмпіянату Еўропы па акадэмічным веславанні. А на Юнацкіх Алімпійскіх гульнях выступіў у ролі капітана беларускай каманды і пранёс сцяг краіны на цырымоніі адкрыцця. Акрамя таго, на самым буйным турніры для маладых спартсменаў Іван заваяваў «серабро» і задаў сабе высокую планку на будучыню. Пра тое, як прайшлі Гульні ў далёкай Аргенціне, свае планы і мэты вясляр расказаў журналісту «Чырвонкі. Чырвонай змены».**

**— Пачнём з нядаўніх Юнацкіх Алімпійскіх гульняў. Раскажы, наколькі важны турнір для маладых спартсменаў?**

— Гэта першыя крокі для нас і магчымасць паказаць, на што ты здольны. На такіх турнірах набіраешся вопыту, знаёмішся з сапернікамі, з якімі прыйдзецца выступаць у далейшым. Трэба адзначыць, што Гульні ў Буэнас-Айрэсе адрозніваліся ад іншых спаборніцтваў, асабліва арганізацыяй. Яны падобныя на «дарослыя» Алімпійскія гульні, усе спартсмены жывуць у адным месцы, ёсць агульная сталовая, зоны, дзе можна адпачыць — маляваць графіці, скакаць на батуце, гуляць у футбол або шахматы. У такой атмасферы цікава спаборнічаць, можна камунікаваць з нашымі і замежнымі спартсменамі з розных відаў спорту.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Пазнаёміцца з прафесіяй

# «УЧАСТКОВЫ — АМАЛЬ ШТО ПСІХОЛАГ»

## Чужое жыццё можа паўплываць на ўласнае

**— Самае складанае ў нашай працы — гэта знаёмства з адміністрацыйным участкам, — упэўнены Уладзімір ШАЎЧЭНКА, капітан міліцыі, старшы ўчастковы інспектар аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі УУС адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы. — Тут неабходна знайсці падыход да кожнага жыхара. А ў старшых участковых іх ажно да трох з паловай тысяч чалавек.**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

### «ВЫБАРУ НЕ БЫЛО»

— На гэтым участку я нядаўна, чатыры месяцы, — праводзіць экскурсію па сваіх «уладаннях» Уладзімір. — Раней быў спальны раён, зараз — больш адміністрацыйных будынкаў. Усюды ёсць свае асаблівасці. Лічу, што ўчастковы павінен не менш за тры гады адпрацаваць на адным участку, каб добра яго вывучыць.

Уладзімір у міліцыі з 2006 года. Хлопец пяць гадоў быў у патрульна-паставой службе, у 2011 годзе перавёўся ва ўчастковыя інспектары.

— У арміі я служыў ва ўнутраных войсках. Бацька мой — лётчык. Спачатку быў ваенным, потым перайшоў у грамадзянскую авіяцыю. Стрыечныя браты таксама працуюць у міліцыі, толькі ў іншай краіне. Як бачыце, усё маё мужчынскае асяроддзе насіла форму. Паддаўся і я, — усміхаецца хлопец.

На пытанне, чаму, як бацька, не захацеў узняцца ў неба, міліцыянер прызнаецца, што баіцца вышыні.

— Мая першая прафесія — станочнік шырокага профілю (токар, фрэзероўшчык). У вучылішчы мне падабалася стаяць каля станка. Нейкія работы нават брали на выстаўку, — успамінае Уладзімір. — Ведаў і ўменняў шмат не бывае. Усё ў жыцці спатрэбіцца.

Бацька, кажа Уладзімір, ніколі не адгаворваў яго ад работы ў міліцыі, хоць і добра разумеў, што хлеб нялёгкі.

— Канешне, падводных камянёў у нашай працы шмат. Галоўнае — навучыцца чуць людзей. Дзейнічаць па шаблоне тут не атрымаецца. Ёсць, вядома, заканадаўчыя акты, якімі мы кіруемся, але чалавечы фактар ніхто не адмяняў. Мы, участковыя, амаль усе псіхолагі. Практыкі, а не тэарэтыкі, — жартуе міліцыянер.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Педсавет

# У ЗОНЕ ПАВЫШАНАЙ УВАГІ

## Як мабільная работа дапамагае вырашаць праблемы падлеткаў?

**Чаму быць падлеткам так цяжка? Пераходны ўзрост — сапраўдны жах! Вакол адны ворагі, усё дрэнна, а адлюстраванне ў люстэрку прымушае думаць, што лепш на людзях увогуле не паказвацца. Але чаму так адбываецца? Чаму падлеткі ўвесь час учыняюць істэрыкі, скандаляць і ўвязваюцца ў сумнеўныя мерапрыемствы? У фізіёлагаў і псіхолагаў ёсць свая версія «пераходнага ўзросту». Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА» падрыхтавала цэлую серыю відэаролікаў, якія на зразумелай падлеткам мове даюць адказы на пытанні, якія хвалююць тынэйджараў: «Чым мужчыны адрозніваюцца ад жанчын?», «Чаму хочацца курыць, калі вып'еш?», «Чаму мы робім тое, што насамрэч не хочам рабіць?», «Ці можна знайсці сваю другую палавінку?», «Калі павінен быць першы раз?», «Ці карысна спаганяць злосць?» і «Як супрацьстаяць тролям?».**

**Падчас міжнароднай канферэнцыі «Інавацыйныя падыходы да работы з падлеткамі і моладдзю: ад арганізацыі сацыяльнай прасторы — да ўстойлівага развіцця грамадства» адзін з такіх відэаролікаў быў прадэманстраваны педагогам. Між іншым, згаданыя відэаматэрыялы знаходзяцца ў свабодным доступе на сайце арганізацыі https://belau.info/video/teenagers/, прычым разам з дапаможнікам па іх выкарыстанні.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



# У ЗОНЕ ПАВЫШАНАЙ УВАГІ



Мабільная работа з моладдзю ў цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Вікторыя».

**Таццяна МАРОЗ, рэктар МГІРА, кіраўнік праекта з беларускага боку:**
**— Мы змаглі сабраць каманду адзінадумцаў з розных дзяржаўных і недзяржаўных структур (педагогаў-псіхолагаў, педагогаў-арганізатараў, сацыяльных педагогаў, класных кіраўнікоў, а таксама прадстаўнікоў праваахоўных структур, сістэмы аховы здароўя, царквы, грамадскіх арганізацый) для работы з моладдзю, якая патрабуе да сябе павышанай увагі. Нам удалося аб'яднаць намаганні Мінскага, Віцебскага і Гродзенскага рэгіёнаў у пошуку найбольш аптымальных мадэляў узаемадзеяння. У аснове мабільнай работы з моладдзю ляжыць індывідуальная і групавая работа, а таксама вулічная пошукавая работа.**
**У аснову праекта быў пакладзены інавацыйны нямецкі вопыт мабільнай работы з моладдзю, які, канешне, давялося адаптаваць да нашых рэалій.**

## Наладзіць кантакт

На канферэнцыі падводзіліся вынікі трохгадовага міжнароднага нямецка-беларускага праекта «Апрабацыя інавацыйнай мадэлі мабільнай працы з моладдзю для прафілактыкі дэвіянтных паводзінаў і сацыяльна-педагагічнай рэабілітацыі». Ён быў распрацаваны Мінскім гарадскім інстытутам развіцця адукацыі (МГІРА) сумесна з нямецкім партнёрам — Міжнародным таварыствам па мабільнай рабоце з моладдзю (ISMO) са Штутгарта (Германія).

«Мабільная работа з моладдзю ўсё больш распаўсюджваецца па ўсім свеце. Чаму? Таму што яна больш гуманная, дзейсная і вымагае меншых выдаткаў, чым застрашванне, пакаранне і турма», — гэтыя словы належаць ганароваму прафесару Цюбінгенскага ўніверсітэта Вальтару Шпехту, заснавальніку мабільнай работы з моладдзю ў Германіі. І сказаў ён іх шмат гадоў назад, але, на жаль, ні навукова-тэхнічны прагрэс, ні развіццё педагогікі не дазволілі ў поўнай ступені вырашыць складаныя праблемы сацыялізацыі падлеткаў і моладзі ў грамадстве. Асоба дзіцяці застаецца такой жа ўразлівай да выклікаў і праблем рэчаіснасці. Без душэўнага болю і стрэсу пераадолець мяжу паміж дзяцінствам і дарослацю ўдаецца далёка не кожнаму...

Калі тэхналогія мабільнай работы з моладдзю стваралася 50 гадоў таму, у цэнтры пільнай увагі былі найперш месцы збору дзяцей і падлеткаў для баўлення часу на вуліцы. Пазней нават з'явіліся такія паняцці, як «вулічны сацыяльны работнік», «сацыяльны работнік за рагом», «палявы сацыяльны работнік», «работа ў адкрытым соцыуме» і «вулічная работа». А сутнасцю мабільнай сацыяльнай работы стаў кантроль за моладдзю, схільнай да дэвіянтных паводзін і агрэсіўнасці, якая не будзе звяртацца ні ў маладзёжныя цэнтры, ні ў кансультацыйныя пункты. Мэта — наладжванне ўзаемадзеяння з членамі нефармальных груп. **Асноўнае прызначэнне мабільнай службы — выкананне ролі пасярэдніка паміж «вулічнымі дзецьмі», членамі нефармальных груповак, наркаманамі, малалетнімі алкаголікамі і грамадствам.** Праўда, у Беларусі «вулічныя дзеці» — толькі адна з мэтавых катэгорый, ёсць і іншыя... Вельмі многім падлеткам падаецца, што яны нікому не патрэбныя, і як вынік — дэпрэсія, агрэсія і злачынствы. Прычынай разбуральных паводзін могуць быць канфлікты ў маладзёжным асяродку, уплыў гаджэтаў, інтэрнэту, некантраляванай прасторы сацыяльных сетак...

Мабільная работа з моладдзю — гэта сацыяльная і педагагічная тэхналогія, якая дазваляе весці прафілактычную работу і тым самым зніжае рызыку здзяйснення супрацьпраўных дзеянняў юнакамі і дзяўчатамі. У рамках мабільнага падыходу спецыяліст сутыкаецца з комплексам праблем маладога чалавека: у адных выпадках гэта прыводзіць да сістэматычнага кансультавання, у іншых — да вырашэння праблемы падключаюцца розныя арганізацыі, зацікаўленыя ў аказанні дапамогі падлеткам і моладзі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

## Спакуса і адказнасць

Амаль штодня мы чуем у навінах пра падзеі, у якіх тым ці іншым чынам удзельнічалі падлеткі: гэта могуць быць крадзеж, разбой, згон аўтатранспартных сродкаў ці гвалт...

— У Мінску назіраецца змяншэнне ўзроўню злачыннасці сярод непаўналетніх, і я лічу гэта вынікам эфектыўнай сумеснай работы многіх структур, — разважае **старшы інспектар па справах непаўналетніх РУУС Маскоўскага раёна сталіцы Сяргей САМОНАЎ.** — Затое падлеткі і моладзь усё часцей уцягваюцца ў распаўсюджванне наркотыкаў. Нарказбытчыкі ананімна размяшчаюць у інтэрнэце прапановы аб продажы рэчываў, грошы ім пераводзяцца анлайн, а пакупнікам паведамляецца пра месца закладкі.

— Уся моладзь сёння знаходзіцца ў інтэрнэце і бачыць прыклады, як можна прыгожа жыць. Гэта бомба замаруджанага дзеяння, — папярэджвае Аляксандр Фейцэр. — А нарказбытчыкі прапануюць падлеткам 4—5 рублёў за адну закладку. Тынэйджар, які нічым не заняты, можа зрабіць і 20 такіх закладак за дзень. Ну як не паддацца спакусе? Так, часта іх падманваюць і ўвогуле нічога ім не плацяць. Між іншым, адзін грам наркотыку, які яны распаўсюджваюць, каштуе каля 120 рублёў.



У Маскоўскім раёне сталіцы вырашылі пайсці шляхам стварэння пакояў вольнага часу на базе ўстаноў адукацыі.

Але калі 13-гадовага падлетка дастаўляюць у таксікалагічнае аддзяленне і вяртаюць да жыцця літаральна з таго свету, гэта я лічу ненармальным. І, на жаль, такія выпадкі не адзінкавыя. Прыкладна 80—90 працэнтаў злачынстваў здзяйсняецца непаўналетнімі ў стане алкагольнага ап'янення, калі ў іх сціраюцца ўсе межы дазволенага. Адзін з самых дзейсных шляхоў прафілактыкі — гэта занятасць падлеткаў. Галоўнае — каб яны не былі пакінуты на саміх сябе. Але калі школа прымушае падлетка ўдзельнічаць у мерапрыемствах, якія яму нецікавыя, то ніякага эфекту ў такой прафілактыцы не будзе. Занятак павінен быць па душы...

**Начальнік аддзялення ўпраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр ФЕЙЦЭР** запэўнівае, што колькасць людзей, якія знаходзяцца на ўліку ў нарколагаў, скарацілася. Прычым група залежных не папаўняецца маладымі людзьмі. Асноўная іх колькасць — гэта людзі ва ўзросце 35 гадоў і старэйшыя.

Гэта каласальны бізнес. Людзі, што ім займаюцца, знаходзяцца за межамі Беларусі і не нясуць ніякай адказнасці, затое ўцягваюць у сваю брудную справу падлеткаў. У бягучым годзе да адказнасці за незаконнае распаўсюджванне наркотыкаў у сталіцы быў прыцягнуты ўжо 21 непаўналетні. А дзяржаўная палітыка ў сферы абароту наркотыкаў надзвычай жорсткая, і дзеянні падлеткаў, якія ўжо займаюцца закладкамі ці трапілі ў поле зроку праваахоўных органаў літаральна з першай спробы «падзарабіць», падпадаюць пад артыкул Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае адказнасць ад васьмі гадоў пазбаўлення волі. **Мінімум восем гадоў! Нават калі ты проста вырашыў кагосьці «пачаставаць», гэта будзе расцэньвацца як збыт наркотыку.**

У жніўні бягучага года ў сталіцы здарыўся трагічны выпадак. Студэнты адной з мінскіх ВНУ сабраліся на кватэры ў адсутнасць дарослых. Прагучала прапанова пакаштаваць наркотык. Набылі, падзялілі пароўну... І вось з сямі чалавек, якія знаходзіліся ў той кампаніі, адна дзяўчына памірае. Для кагосьці і першая сустрэча з наркатычным рэчывам можа закончыцца смерцю.

Самымі распаўсюджанымі ў свеце праграмамі першаснай прафілактыкі з'яўляюцца адукацыйныя антыалкагольныя і антынаркатычныя праграмы. Але і замежны, і наш вопыт сведчыць, што праграмы, арыентаваныя толькі на інфармацыю аб негатыўных наступствах спажывання псіхаактыўных рэчываў, аказваюцца менш эфектыўныя, чым тыя, якія навучаюць адаптыўнаму стылю жыцця, навыкам стасункаў, крытычнаму мысленню, уменню прымаць рашэнні і супрацьстаяць у сітуацыях, калі прапануюць забароненае. Некаторыя падлеткі, нават калі яны падпадаюць пад многія фактары рызыкі, не спажываюць наркотыкі і алкаголь. Даследаванні паказваюць, што ад гэтага іх страхуе мноства ахоўных жыццёвых навыкаў і ўстановак: пачуццё гумару, унутраны самакантроль, мэтанакіраванасць, важнасць узаемаадносін сама меней з адным дарослым чалавекам (акрамя бацькоў), выкананне нормаў грамадства, школы і сямейных стандартаў паводзін.

## У цяпле і без дарослых!

Сёння дзеці могуць апынуцца на вуліцы па розных прычынах, у тым ліку і з-за праблем ва ўласнай сям'і. Ім не хочацца ісці дамоў, таму большую частку свайго часу яны праводзяць з кампаніяй у двары ці ідуць з сябрамі ў гандлёвыя цэнтры. Нават па самай аптымістычнай статыстыцы, аб'яднаннямі па інтарэсах ахоплены толькі кожны трэці школьнік.

— А наша анкетаванне паказала, што больш як 50 працэнтаў навучэнцаў бавяць вячэрні час у стасунках з сябрамі на вуліцы і яшчэ 30 працэнтаў сядзяць дома за тэлевізарам ці камп'ютарам, — падзялілася назіраннямі **сацыяльны педагог сталічнай сярэдняй школы № 9 Ірына СУШЧЫНСКАЯ.** — Таму мы ў сваім Маскоўскім раёне вырашылі пайсці шляхам стварэння пакояў вольнага часу або вячэрняй занятасці на базе ўстаноў адукацыі, куды дзіця зможа прыйсці без нейкай канкрэтнай мэты, каб проста пабыць у цяпле, пагуляць у настольныя гульні, паглядзець тэлевізар або зрабіць урокі ў цішыні. Загадзя пацікавіліся ў дзяцей, як бы яны хацелі бавіць свой вольны час, прычым пыталіся ў групы школьнікаў, не ахопленых заняткамі па інтарэсах. Большасць з іх выбралі стасункі ў нейкім месцы, але галоўнай іх умовай была адсутнасць дарослых!

У нашай школе такі пакой уяўляе сабой звычайнае памяшканне. Ніякіх асаблівых выдаткаў для яго абсталявання не спатрэбілася: хтосьці падзяліўся непатрэбнай мэбляй, тэлевізарам, чайнікам... Для таго каб наведаць пакой, не трэба нідзе загадзя рэгістравацца ці запісвацца, дастаткова проста ўзяць ад яго ключ. Можна прыйсці з сябрам з іншай школы. Канешне, ва ўстанове адукацыі абавязкова дзяжурыць спецыяліст псіхолага-педагагічнай службы, але толькі калі дзеці адчуюць сябе ў камфорце і бяспецы, можна будзе ненавязліва і непрыкметна праводзіць сярод іх прафілактычную работу... Мы лічым, што такія пакоі павінны быць ва ўсіх установах адукацыі...

Важна, што вынікі міжнароднага праекта былі пакладзены ў аснову матэрыялаў для правядзення рэспубліканскага эксперымента «Апрабацыя мадэлі рэгіянальнага рэсурснага цэнтра для прафілактыкі дэвіянтных паводзін і сацыяльна-педагагічнай рэабілітацыі навучэнскай моладзі». Праект уключылі ў пералік рэспубліканскіх эксперыментальных пляцовак, і ў 2018—2020 гадах ён будзе рэалізаваны ў Мінскім і Віцебскім рэгіёнах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Вольга РЭНШ-ВЕТЦЭЛЬ, дырэктар прадстаўніцтва грамадска-карыснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Internationales Bildungs und Begegnungswerk gemeinnützige Gesellschaft mit beschränkter Haftung» (г. Дортмунд, ФРГ):**
**— Гэты праект цяжка нараджаўся, бо мы ўсе з задавальненнем працуем з адоранымі дзецьмі, і зусім іншая справа — дзеці, якія дапусцілі памылку і якім патрабуецца дапамога дарослых, але яго вынікі пераўзышлі нашы чаканні. Мы ў Германіі кажам, што старшае пакаленне мае патрэбу ў маладым. Маладыя заўсёды будуць ставіць перад намі новыя выклікі. Немцы таксама любяць казаць, што «мы будуем масты», але трэба заўсёды мець на ўвазе, што на адным мосце з намі можа аказацца мядзведзь, і пакуль мы ідзём з ім разам, павінны яго паважаць. Не трэба нікога спіхваць з моста...**

*Ідэі маладых*

# «ПАДЛЕТКІ НЕ МАГЛІ ТАКОЕ ПРЫДУМАЦЬ!»

## Будучыя біятэхнолагі ратуюць горад ад пластыку



**За месяц у офісе, дзе працуюць 30 чалавек, расходуецца 2500 аднаразовых кубачкаў і 5000 лістоў паперы для друку. А калі там дрэнна ўцеплены дзверы і вокны, то праз іх сыходзіць 70 працэнтаў цяпла. Як зрабіць рабочыя месцы больш экалагічнымі? Над гэтай праблемай задумаліся студэнткі БДУ і стварылі службу кансалтынгу bCool, каб дапамагаць офісам расходаваць менш рэсурсаў і жыць у гармоніі з прыродай.**

Алеся ЛУКАШЭВІЧ, Яўгенія ХЮППЕНЕН і Вікторыя КАРСЮК — першакурсніцы біялагічнага факультэта. Яны знаёмыя яшчэ са школьных гадоў: разам вучыліся ў сталічным ліцэі № 1 на хіміка-біялагічным профілі. Экалогіяй захапіліся, калі ў 11 класе пісалі пад кіраўніцтвам настаўніцы навукова-практычную работу. Тэма даследавання, якую выбралі Алеся, Жэня і Віка, — як зрабіць аднаразовы посуд экалагічным. Замяніць пластыкавыя кубачкі папяровымі? Але апошнія таксама знутры абклейваюць пластыкам. Дзяўчаты вырашылі паспрабаваць варыянт з ядомым посудам. Закупілі тарталеткі і пачалі тэсціраваць розныя пакрыцці. Тое, якое не прапускае ваду, удалося атрымаць, змяшаўшы пэўныя харчовыя хімікаты (тэхналогію запазычылі з малекулярнай кухні).

З гэтай ідэяй вучаніцы ўдзельнічалі ў розных конкурсах для школьнікаў, але нічога не выйшла. Ім або казалі, што гэта ўсё даўно прыдумана (праўда, пацвердзіць словы канкрэтнымі прыкладамі і спасылкамі ніхто не змог), або не верылі, што падлеткі здольныя такое вынайсці.

У верасні дзяўчаты вырашылі паспрабаваць свае сілы на хакатоне Social Weekend, дзе розныя каманды прэзентавалі спосабы вырашэння сацыяльных праблем. І нечакана для сябе атрымалі грошы на развіццё свайго праекта. Тэхналогію яны сталі апрацоўваць на посудзе большага памеру: заказвалі на фабрыцы вафельныя кубачкі для марожанага і дома на кухні ўручную наносілі на іх спецыяльнае пакрыццё. Праўда, цуда-састаў аказаўся капрызным, і на замену яму знайшлі іншы варыянт — воск і харчовы парафін.

— Гэта бяспечна. Такія кубачкі падыходзяць для халодных напояў. Паўгадзіны вада ў іх дакладна прастаіць — каб папіць з кулера, гэтага больш чым дастаткова, — расказваюць студэнткі. — Такі посуд можна ўтылізаваць без шкоды для прыроды. Ці проста з'есці.

Вафельныя кубачкі ад дзяўчат ужо з'явіліся ў адной прыватнай мінскай бібліятэцы, іх таксама заказвалі на мерапрыемства. Але Жэня, Віка і Алеся вырашылі пайсці далей: прапаноўваць кампаніям не толькі замяняць пластыкавы посуд, але і ў цэлым рабіць офісы экадружалюбнымі. І некаторыя прадпрыемствы ўжо зацікавіліся такой паслугай.

— Мы будзем прыязджаць у офіс, пільна аглядаць яго, даведвацца пра колькасць супрацоўнікаў, прыкідваць расходы розных матэрыялаў, выдаткі на водазабеспячэнне і электрычнасць. І прапаноўваць падрабязныя рэкамендацыі, якія дапамогуць кампаніі не толькі стаць больш экалагічнай, але і сэканоміць уласныя сродкі. У залежнасці ад жадання і бюджэту заказчыка можна пайсці як на невялікія крокі, так і на глабальныя змены. Мы самі будзем весці перагаворы з пастаўшчыкамі неабходнага абсталявання і ўкараняць гэтыя навінкі ў офісе, — тлумачаць дзяўчаты.

Самае простае, што можна зрабіць, — паставіць шматразовы посуд, арганізаваць асобны збор адходаў, закупіць паперу з другаснай сыравіны (такую, напрыклад, выпускае Барысаўская фабрыка), замяніць люмінесцэнтныя лямпачкі на святлодыёдныя, устанавіць свяцільні з датчыкам руху ў прахадных памяшканнях.

Што да больш прасунутых рашэнняў, то ў офісе можна перапрацоўваць арганічныя адходы. Для гэтага ёсць здрабняльнік, які ўбудоўваецца пад ракавінай, ці пакаёвы кампосцер (ён падобны да звычайнай сметніцы і пры правільным выкарыстанні не стварае непрыемнага паху).

На заўвагу «няўжо кампаніі самі не знойдуць такіх рашэнняў у інтэрнэце?» студэнткі адказваюць: па-першае, не ўся інфармацыя ёсць у сеціве. А па-другое, занятым людзям часта проста не хапае часу на гэта, таму клопат пра рабочыя месцы адыходзіць на другі план.

— Мы стараемся шукаць таксама «хіпстарскія» ідэі, — дадаюць дзяўчаты. — Напрыклад, ёсць экастартап для аналізу спажывання электраэнергіі. Спецыяльны датчык падключаецца да сеткі і з дапамогай мабільнай праграмы паведамляе ўладальніку, які прыбор і колькі энергіі спажывае. Можна ўбачыць слабыя месцы: дзе своечасова не выключаюць тэхніку, што з абсталявання няспраўнае ці неэфектыўнае.

Галоўная ж мэта праекта — данесці ідэю адказнага спажывання да супрацоўнікаў, каб яны і па-за межамі офіса клапаціліся пра прыроду. Дзяўчаты збіраюцца па запрашэнні кампаній праводзіць майстар-класы, ладзіць сустрэчы з іншымі экалагічнымі ініцыятывамі.

— Адзін з найлепшых прыкладаў «зялёных» офісаў — будынак Сусветнага фонду дзікай прыроды ў Маскве. Ён узводзіўся з улікам усіх экалагічных навінак. Там выкарыстоўваюцца толькі натуральныя матэрыялы, ёсць сістэма збору дажджавой вады. Але мы разумеем, што многія беларускія офісы знаходзяцца ў старых памяшканнях і такія кардынальныя рашэнні там немагчымыя. Таму наша мэта — рабіць простыя рэчы і прасоўваць экаідэалогію. Маленькія крокі таксама даюць эфект.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*Дацягнуцца да зор*

# ПА ЗАКОНАХ КОСМАСУ



**«Хочаш запусціць спадарожнік, арбітальную станцыю? Засяліць Месяц і Марс? Здабываць рэсурсы на астэроідзе? А можа, проста прыляцець на іншую планету на кактэйль? Спачатку пацікаўся касмічным правам і даведайся, ці можна гэта рабіць!» — гаворыць магістрант факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Дар'я БОГДАН. Сёлета яна з дапамогай выкладчыцы Кацярыны Кузняцовай сабрала каманду для ўдзелу ў самых прэстыжных студэнцкіх спаборніцтвах. Пісьмовая пазіцыя (мемарыял) прадстаўнікоў Беларусі ў Міжнародным конкурсе па касмічным праве імя Манфрэда Лахса, што прайшоў у нямецкім Брэмене ў рамках Міжнароднага кангрэса астранаўтыкі, стала найлепшай у свеце!**

Калі па-простаму, міжнароднае касмічнае права — гэта звод правіл для дзяржаў і міжнародных арганізацый па вядзенні імі дзейнасці ў космасе. Яно, у прыватнасці, грунтуецца на дагаворах, нацыянальных заканадаўчых актах і каментарыях да іх.

Дар'я Богдан пачала цікавіцца касмічным правам яшчэ падчас вучобы на першым курсе, калі даведалася пра муткорты — конкурсы вучэбных судовых мадэляваных працэсаў. Пазней прыйшла ідэя стварыць сваю каманду для ўдзелу ў конкурсе.

— Добрая каманда — больш чым палова поспеху, — лічыць Дар'я. — Сабраць яе было няпроста, але ў нас усё атрымалася. Хаця, па шчырасці, у гэтую авантуру мала хто верыў. Выкладчыца Кацярына Уладзіміраўна Кузняцова пагадзілася быць трэнерам. Потым падцягнуліся астатнія: чацвёртакурсніца Алена Лаўрэнава і асістэнт трэнера Тацяна Зінякова.

Спачатку дзяўчаты перамаглі ў Еўрапейскім раўндзе, а затым прадставілі Еўропу ў сусветным фінале. Умовы конкурсу былі найскладанейшыя. Двум удзельнікам трэба напісаць пазіцыю за істца і адказчыка (мемарыял) на тую ці іншую тэму аб'ёмам у дзевяць тысяч слоў. А пасля выступіць з ёю ў фармаце пятнаццаці-сямнаццаці хвілін. І ўсё гэта — па-англійску! Таму пра падрыхтоўку і ўдзел у конкурсе дзяўчаты шчыра кажуць: было доўга і пакутліва.

**«Касмічная супольнасць вельмі зацікаўлена ў «голасе маладых», іх актыўнай пазіцыі».**

— Калі знаёмішся з тэкстамі міжнародных дагавораў у касмічнай сферы, то разумееш, што яны не даюць вычарпальных адказаў на ўсе пытанні, — тлумачыць Дар'я Богдан. — Даводзіцца падключаць сваю крэатыўнасць і будаваць аргументацыю з яе дапамогай. Але суддзі могуць задаць любыя пытанні.

...Нягледзячы на недахоп часу, на тое, што прыходзілася ахвяраваць забавамі, выхаднымі і нават сном, успаміны ў каманды і пра трэніроўкі, і пра ўдзел у конкурсе — самыя пазітыўныя. За гэты перыяд кафедра міжнароднага права стала для дзяўчат і іх трэнераў другім домам. Тут па вечарах яны пісалі мемарыял, трэніравалі вусную частку, спрачаліся пра выбар аргументаў, «выратоўвалі» свет ад перанасялення і голаду. У іх была неверагодная матывацыя не проста паўдзельнічаць, а дасягнуць пэўнага выніку.

— Калі ёсць мэта і жаданне — знаходзяцца і сілы! — па-філасофску ставіцца да цяжкасцяў Дар'я. — Спачатку адкрываецца другое дыханне, а там і трэцяе... Я веру, што конкурс паспрыяе вырашэнню глабальных праблем чалавецтва. Касмічная супольнасць вельмі зацікаўлена ў «голасе маладых», іх актыўнай пазіцыі.

...Пасля вяртання са спаборніцтваў Дар'я Богдан прыдумала стварыць Школу па міжнародным касмічным праве як праект Кансультатыўнага савета касмічнага пакалення Беларусі.

— Зарэгістравалася 48 удзельнікаў, — расказвае яна, — у тым ліку і тыя, хто не валодае ведамі ў сферы права. Менавіта таму мы пачалі з уводзін у міжнароднае права. Астатнія тры заняткі школы былі прысвечаны найбольш актуальным пытанням у касмічным праве: здабычы касмічных рэсурсаў, мірнаму выкарыстанню касмічнай прасторы, адказнасці за касмічную дзейнасць і шкоду, прычыненую касмічнымі аб'ектамі. Таксама правялі дзве skype-сесіі з запрошанымі лектарамі. Адну — з Кацярынай Далдырынай, кандыдатам юрыдычных навук, юрыстам кампаніі D-Orbit, па пытаннях камерцыялізацыі касмічнай дзейнасці. Другую — па пытаннях выкарыстання касмічнай прасторы ў мірных мэтах і перспектывах стварэння касмічных войскаў, — з Майклам Фрыдлам, трэнерам каманды на конкурс імя М. Лахса ад універсітэта Вены. Лектарам у школе выступіла і калега Дашы па конкурсе Алена Лаўрэнава.

...Цікава, што да самога космасу дзяўчаты ставяцца па-рознаму. Дар'я спадзяецца паляцець да зор, калі ўмовы ў касмічнай прасторы стануць больш камфортнымі. А Алену больш цікавяць прававыя аспекты касмічнай дзейнасці. Хаця адзін яе знаёмы астранаўт нейк жартам заўважыў, што яна не здолее па-сапраўднаму займацца касмічным правам, не пабываўшы ў космасе.

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

Нечакана!

# «ДАШКОЛЬНІК»... ЮРЫЙ ВІКТАРАВІЧ

## Ён вучыць дзетак, а тыя — яго



**У віцебскіх дзіцячых яслях-садку № 52 выхавальнікам працуе 22-гадовы Юрый ЛІТОШЫК. У яго «падпарадкаванні» так званая малодшая група, у якой 26 дзетак ва ўзросце трох-чатырох гадоў. З такімі малымі нават вопытным педагогам працаваць складана. Параўнальна працай з тымі, каму пяць-шэсць гадоў. А ў новага супрацоўніка атрымліваецца ўсё вельмі добра!**

Загадчык установы Тацяна Церашкова вельмі хваліла Юрыя Віктаравіча. Расказала, што ён трапіў на працу па размеркаванні пасля таго, як сёлета атрымаў дыплом у Полацкім дзяржаўным універсітэце. Цікава, што хлопец прафесійны, як кажуць педагогі, «дашкольнік» — вучыўся менавіта па гэтай спецыяльнасці на факультэце дашкольнай адукацыі. Канешне, цяперашнія калегі выхавальніка спачатку, мякка кажучы, былі трохі здзіўлены навіне пра тое, што хлопец будзе працаваць на гэтай пасадзе. Ды і бацькі таксама, дзеткі. Але ўжо праз некалькі дзён усе здзівіліся яшчэ больш, бо малады спецыяліст зачараваў сваімі інтэлігентнасцю, сціпласцю, ветлівасцю.

Юрый падчас нашай размовы расказаў, што ён з дынастыі педагогаў. Мама працуе фізруком у іншай віцебскай установе дадатковага навучання — у дзіцячым цэнтры развіцця. Чаму выбраў нетыповую для мужчын спецыяльнасць? Сказаў, што вельмі любіць дзяцей. Як старэйшы сын у сям'і дапамагаў выхоўваць брата, які на дзесяць гадоў малодшы за яго. Пасля заканчэння віцебскай гімназіі № 2 Юрый вызначыўся, што абавязкова будзе педагогам. Калі вучыўся ў ВНУ на чацвёртым, апошнім, курсе, паспяваў падпрацоўваць выхавальнікам у наваполацкім дзіцячым садку. Таму невялікі вопыт ужо быў.

...Пакуль гутарылі, праведаць дачку Вераніку прыйшла яе мама Вольга Шаршнёва. Жанчына, мама дваіх дзяцей, з радасцю падзялілася прыемнымі ўражаннямі. Расказала, што малая вельмі ахвотна ходзіць у садок. І па выхадных, бывае, сумуе без свайго любімага выхавальніка. Тэлефануе яму.

Юрый прызнаўся, што не толькі ён, але і дзеці вучаць яго, напрыклад цярпенню, і па чарзе расказваюць яму пра модныя цацкі, гульні, якія купляюць ім бацькі.

Знаёмыя выхавальніка з разуменнем ставяцца да прафесійнага выбару, хоць сябры-хлопцы кажуць, што не змаглі б працаваць у садку на яго пасадзе. Дарэчы, суразмоўнік пакуль халасцяк...

Хлопец захапляецца падарожжамі. Разам з сябрамі ездзіць па гарадах Беларусі на адна- і двухдзённыя экскурсіі. Вучыцца граць на гітары і кухарыць. Апошняму давялося навучыцца, калі жыў у інтэрнаце. Пры гэтым рабіў не толькі простыя стравы — кашы і гэтак далей, — але і кулінарныя «шэдэўры». Напрыклад, бульбяныя шарыкі з сырам унутры. Прызнаўся, што падгледзеў, як гэта робіцца, у інтэрнэце. Прыдумваў і аўтарскія соусы.

Юрый павінен адпрацаваць у садку два гады. Наконт таго, ці застанецца тут надалей, адказаў, што пакуль пра гэта не думае. На сёння яму ўсё падабаецца. Хлопец вельмі актыўна бярэ ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах. Падчас навагодніх ранішнікаў будзе Дзедам Марозам, потым на розных святочных мерапрыемствах збіраецца выконваць мужчынскія ролі. Як малады спецыяліст наведвае канферэнцыі, сімпозіумы, семінары, развіваецца ў сваёй прафесіі.

Ва ўсёй краіне мужчын на пасадзе выхавальніка можна пералічыць літаральна па пальцах. Добра, што і віцебскім дзеткам пашанцавала!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



# «УЧАСТКОВЫ — АМАЛЬ ШТО ПСІХОЛАГ»

### СЛЯПАЯ ЛЮБОЎ...

— Міша працуе ўжо тры месяцы! Хутка павінен быць дома. Заняты па 12 гадзін у суткі. Але, на жаль, нічога толкам не зарабляе, усяго 350 рублёў. Я яго кармлю. Мабыць, абдурвае? — з парога паспявае паведаміць пра галоўныя падзеі ў сваім жыцці жанчына гадоў пяцідзесяці.



**По статыстыцы, ахвярамі хатняга гвалту ў 75 % становяцца жанчыны.**

— Як зараз паводзіць сябе сын? — пытаецца ўчастковы.

— Расказваць усё як ёсць? З турмы прыйшоў — б'е мяне, п'е, — уздыхае ахвяра хатняга гвалту. — Усё, што ў мяне было, я ўклала ў гэтую кватэру! Паглядзіце, які рамонт зрабіла, так сына чакала. А колькі пацягнула ў мяне турма! Я яму грошы кожны месяц дасылала, перадачы збірала. А як інакш? Ён жа ў мяне адзінае дзіця! Якія лісты мне адтуль пісаў! Ён добрым як цяля становіцца, калі есці хоча. А калі сыты — адны крыкі і мацюкі. Як трасяне мяне, дык далятаю да суседняга пакоя. Прашу: «Пашкадуй маці!»

— Пра новыя інцыдэнты ў міліцыю паведамлялі?

— Не. Разумееце, калі б гэта адразу зрабіць... А так — супакоілася, астыла, даравала. Ён заўжды клянецца, што гэта апошні раз! Вы бачыце, як я «высахла»? На 20 кілаграмаў схуднела, — пераключаецца гаспадыня. — Яму проста ажаніцца трэба. Малю Бога, каб знайшоў якую дзяўчыну і сышоў ад мяне.

— Не беражаце вы сябе, — звяртаецца да суразмоўніцы Уладзімір. — Такое нельга дараваць. Яшчэ некалькі падобных выхадак — і Міша зноў пойдзе па знаёмым яму шляху.

— Калі ён выйшаў з турмы — я яму рукі цалавала, — выцірае слёзы жанчына. — Мацярынская любоў — сляпая.

...Сярэдні ўзрост тых, хто часцей за ўсё трапляе ў поле зроку ўчастковага, — людзі ад 25 да 35 гадоў. Мужчын сярод іх больш, але працаваць складаней з жанчынамі:

— Возьмем хоць бы алкагольную залежнасць. Жанчын гэта атрута зацягвае мацней, і нешта растлумачыць ім становіцца цяжка. А чалавек у нецвярозым стане, як усім вядома, — патэнцыйны злачынец.

Уладзімір кажа, што, па яго назіраннях, моладзь стала больш насцярожана ставіцца да розных псіхатропных рэчываў.

— Яны бачаць, чуюць, чытаюць (добра, што інфармацыі зараз шмат), да чаго гэта можа прывесці, і робяць адпаведныя высновы. Вучацца на чужых памылках, — мяркуе міліцыянер.

Участковы прызнаецца, што не змог бы працаваць інспектарам па справах непаўналетніх.

— Лічу, што маладзі трэба даваць шанц. Ведаеце, заўсёды адчуваецца, каму ён патрэбны, а каму — не. У іх жа ўсё жыццё яшчэ наперадзе, і хто ведае, як адгукнецца тая ці іншая іх выхадка? А падлеткі такія эмацыянальныя! Вельмі шкада дзяцей, якія заблыталіся. У міліцыі працуюць не роботы — у нас таксама ёсць пачуцці, — кажа Уладзімір. — Калі міліцыянер затрымлівае юнака, таму падаецца, што мы самыя дрэнныя на свеце людзі! Але лепей адзін раз скласці да правапарушэнне адміністрацыйны пратакол, чым хлопец адчуе сваю беспакаранасць і пойдзе хуліганіць далей.

### НАДЗЕЙНЫ ТЫЛ

— Тое, што бачыць на працы ўчастковы, прымушае глядзець на ўласнае жыццё інакш. Хочацца ўсё рабіць правільна, быць для іншых прыкладам. Я, калі нарадзіўся сын, кінуў курыць, — расказвае Уладзімір. — Зараз Арцёму чатыры з паловай гады. На сям'ю, на жаль, з-за ненармаванага графіка часу хапае не заўсёды. Калі іду на працу, асабліва ў выхадныя дні, Цёмка заўжды кажа: «Не ідзі, тата. Давай дома пагуляем». Але служба ёсць служба. Сын любіць прымяраць мае фуражкі. Усім у дзіцячым садку расказвае, што тата ў яго міліцыянер. Прыемна.

Уладзімір пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай на працы. Наталля — інспектар крымінальна-выканаўчай інспекцыі.

— Мне пашанцавала, — упэўнена кажа суразмоўнік. — Калі затрымліваюся на працы, нават да раніцы, з улікам, што працоўная змена скончылася ў 18 гадзін, Наталля ўсё разумее. Ёй нават тлумачыць нічога не трэба, бо сама добра ведае гэтую «кухню». Я не буду настойваць, каб Арцём пайшоў служыць у міліцыю. Гэта павінен быць яго выбар. Для пачатку паспрабую зрабіць так, каб час сына быў заняты з карысцю. Планую аддаць яго ў Сувораўскае вучылішча. Але кожны раз, калі Цёма мяне абдымае пасля працы, думаю, што проста не змагу яго кудысьці адпусціць, — усміхаецца ўчастковы.

Уладзімір цікавіцца аўтамабілямі, успамінае, што ў дзяцінстве заўсёды з бацькам прападаў у гаражы. Участковы калекцыянуе незвычайныя шарыкавыя ручкі, вырошчвае хатнія кветкі. Толькі ў невялічкім рабочым кабінеце міліцыянера красуюцца 22 расліны! І ўсе іх даглядае ён сам.

— Мне падаецца, што зараз людзі больш паважліва ставяцца да міліцыянераў, чым гадоў дзесяць таму. Гэта добрая тэндэнцыя, — лічыць хлопец.

Уладзімір хоча і далей рухацца па кар'ернай лесвіцы. Але менавіта на пасадзе ўчастковага. Пераходзіць у іншы аддзел не плануе: пачынаць нешта новае заўсёды цяжка.

— Памятаю, як толькі прыйшоў ва ўчастковыя інспектары, галава кругам ішла ад усіх гэтых пытанняў і праблем! Як усім дапамагчы? Як ва ўсім разабрацца? Усё прыходзіць з вопытам, на прыкладзе адной сям'і разумееш, як быць з іншай. Нешта раяць калегі, — кажа суразмоўнік. — Ёсць такія «падапечныя», якія ўжо даўно знаходзяцца не на маім участку, але я да гэтага часу іх наведваю. Не паверыце, але па-сапраўднаму хвалююся, як яны там.



**«Да некаторых «падапечных» хаджу так часта, як дадому».**

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

*Свае традыцыі*

# СУПЕРМАРКЕТ БЕЗ КАСІРАЎ І ШЭДЭЎРЫ ВАН ГОГА

## Што паглядзець у Амстэрдаме за тры дні



Дамы ў Амстэрдаме непадобныя адзін да аднаго.

**У гэтым горадзе непрадказальнае надвор'е, веласіпедаў больш, чым жыхароў, а ў музеях выстаўляюць не толькі творы мастацтва, але і прылады для сексу. Амстэрдам настолькі папулярны ў вандроўнікаў, што ўлады па просьбе мясцовага насельніцтва задумваюцца аб тым, каб павысіць турыстычны падатак і забараніць здаваць кватэры на суткі ў цэнтры. Чаму ваш найлепшы сябра ў галандскай сталіцы — гэта пластыкавая картка, дзе можна знайсці цюльпаны ў горадзе ў любую пару года і чым частуюць у кавашопах. Давайце разбірацца разам...**

### НА РАБОТУ — НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

Амстэрдам — горад тэхналогій. На вакзале няма касіраў: білеты на грамадскі транспарт купляеш праз тэрмінал (запасіцеся манетамі або пластыкавай карткай, бо купюры ён не прымае). На вуліцах стаяць аўтаматы з падагрэтымі бургерамі: апускаеш пару еўра — і забіраеш з ячэйкі гарачы перакус.

У супермаркетах таксама большасць кас працуе без прадаўцоў. Абслугоўваеш сябе сам — сканеуш штрых-код прадуктаў і прыкладаеш картку, каб разлічыцца. Хоць у маленькіх крамах тэхналогіі пакуль не выцеснілі чалавека.

У аўтобусах бясплатны вай-фай. А ў электробусах яшчэ і раздым для USB-кабеля, каб падзарадзіць гаджэт. Элекрамабілі тут, дарэчы, не рэдкасць: яны ёсць нават у таксапарках. А разеткі для «запраўкі» такіх аўто ўстаноўлены непадалёк ад уваходных дзвярэй дамоў.

Але па горадзе вельмі мала хто ездзіць на ўласных машынах. Па-першае, дарогі тут вузкія. А па-другое, клапоцячыся аб экалогіі, галандцы аддаюць перавагу веласіпедам — зранку ў строгіх касцюмах і спадніцах едуць на іх на работу. Велапаркоўкі ў Амстэрдаме на кожным кроку — як і таблічкі каля кавярняў і крам з просьбай не пакідаць тут свой двухколавы транспарт. Веласіпеды часта крадуць, таму многія гараджане ездзяць на старэнькіх, а кошт замка для «жалезнага каня» можа быць вышэйшым за цану яго самога.

**Папулярным фаст-фудам лічыцца... селядзец. Падаюць яго ў булачцы з цыбуляй і марынаванымі агуркамі.**

### З ГІСТОРЫІ МАСТАЦТВА І НЕ ТОЛЬКІ

Што паглядзець? Вядома ж, архітэктуру. Прагуляйцеся па брукаваных вулачках уздоўж каналаў, каб палюбавацца дамамі, якія стаяць каля самай вады, шчыльна прыціснуўшыся адзін да аднаго. Будынкі такія вузкія, бо ў Сярэднявеччы бралі падатак за шырыню фасада. Дзверы і лесвіцы ў старых дамах таксама вузкія, а таму мэблю і іншыя буйнагабарытныя рэчы дастаўляюць праз шырокія вокны — пад дахам спецыяльна для гэтага прымацаваны крук. Многія гараджане не зашторваюцца, і, ідучы па вуліцы, можна выпадкова ўбачыць праз акно, як вячэрае звычайная галандская сям'я. Кажуць, гэта традыцыя — не падглядаць у вокны, а трымаць іх адкрытымі — пайшла з Сярэдніх вякоў, калі герцаг Альба баяўся рэвалюцыі і патрабаваў, каб усё было на віду.



Традыцыйны галандскі абутак — кломпы.

У спісе славутасцяў таксама старая каменная царква Аўдэкерк, узведзеная ў XIV стагоддзі, цагляны будынак былой галоўнай фондавай біржы сталіцы, каралеўскі палац.

Зазірніце на кветкавы рынак непадалёк ад цэнтра, дзе прадаюцца цюльпаны ўсіх сартоў. І не толькі яны: на прылаўках ёсць нават саджанцы каноплі — у Нідэрландах дазволена іх вырошчваць для ўласнага карыстання. А яшчэ на гэтым рынку бадай самыя танныя сувеніры ў горадзе.

У Амстэрдаме шмат музеяў. Самы папулярны прысвечаны Ван Гогу. Калі збераецеся туды, закажыце білет загадзя праз інтэрнэт: у дзень наведвання іх можа ўжо не быць у продажы. У музеі сабраны амаль усе вядомыя карціны мастака — «Сланечнікі», «Пшанічнае поле з варонамі», «Едакі бульбы». Нават калі вы нічога не ведаеце пра Ван Гога акрамя таго, што ён адрэзаў сабе вуха (аўтапартрэт, напісаны пасля гэтага здарэння, дарэчы, таксама вісіць у адной з залаў), не хвалюйцеся. Возьмеце зручны мультымедыягід, дзе ёсць экскурсія на рускай мове, і пачуеце, чаму мастак маляваў у такой дзіўнай тэхніцы і навошта яму столькі партрэтаў самога сябе (спойлер: на натуршчыкаў у будучага генія проста не было грошай).

Літаральна за некалькі крокаў знаходзіцца Рэйксмузеум — дзяржаўны мастацкі музей Нідэрландаў. Турысты сцякаюцца сюды, каб пабачыць «Начны дазор» Рэмбранта. Падказка: побач з гэтай карцінай (і іншымі значнымі творамі) ёсць раздрукаваныя памяткі на англійскай мове, дзе тлумачыцца, чаму гэта шэдэўр. З нечаканага — у музеі можна знайсці велізарныя лялечныя домікі XVII стагоддзя. Але гэта цацкі не для дзяцей, а для заможных жанчын, у якіх было шмат грошай і вольнага часу. Спадарыні абсталёўвалі домікі з такой увагай да дэталяў, што сёння па іх можна лёгка ўявіць, як выглядала жыллё тагачасных арыстакратаў.

Дарэчы, перад Рэйксмузеумам знаходзіцца той самы славуты надпіс I amsterdam. Але нават не спадзявайцеся на прыгожае фота побач з ім: дзясяткі турыстаў, якія таксама хочуць здымак на памяць з фішкай горада, будуць вісець у вас над галавой і выглядаць з-за пляча.

Але пакінем мастацтва. Упэўнена, большасць падарожнікаў едзе ў Амстэрдам паглядзець не толькі карціны Рэмбранта, але і квартал «чырвоных ліхтароў». Увечары гэта самы ажыўлены раён горада. У вокнах публічных дамоў красуюцца аголеныя жанчыны, тут гэта легальны занятак: секс-работніцы плацяць падаткі, маюць сацпакет і прафсаюз. А на вітрынах будынкаў квартала вісяць аб'явы аб здачы «офісаў» у арэнду. Акрамя публічных дамоў тут працуюць эратычныя клубы і прыватныя кабінкі для прагляду «гарачых» шоу.

Амаль гэтак жа часта, як сувенірныя крамы, па горадзе сустракаюцца кавашопы. Толькі прадаюць там не каву, а марыхуану. З-за яе на вуліцах бывае спецыфічны пах. Калі думаеце, што ён падобны да водару прыпраў, то моцна памыляецеся: гэта, хутчэй, рэзкі пах гумы — вельмі непрыемны.

### МОРА, ЧАЙКІ І ВЕТРАНЫЯ МЛЫНЫ

Каб лепш пазнаць Нідэрланды, не палянуйцеся выбрацца ў прыгарад. У спісе must see — Валендам і Заансе Сханс. І туды, і туды з цэнтральнага вакзала кожныя 15 хвілін ходзяць аўтобусы.

Валендам — гэта рыбацкая вёска. Акуратныя домікі з тэрасамі, лавачкі на ўзбярэжжы (адны з відам на вёску, другія — развернутыя да мора) і чайкі, якія абсалютна не баяцца людзей і паблажліва пазіруюць для фота. Пакуль я абедала ў кавярні, на рыбны кіёск, што стаяў насупраць, прызямлілася чапля... На набярэжнай шпацыруе шмат турыстаў, але варта звярнуць на суседнюю вулачку, і вы не сустрэнеце ні душы: толькі вецер гойдае бялізну на вяроўцы, нацягнутай паміж дамамі.

Хочаце ўбачыць сапраўдныя драўляныя млыны? Едзьце ў Заансе Сханс — музей пад адкрытым небам, дзе сабраны аўтэнтычныя пабудовы XVII—XVIII стагоддзяў з усёй краіны. Ветраныя млыны да сёння працуюць: на іх вырабляюць фарбы, алей, гарчыцу. У вёсцы можна пабачыць, як выразаюць кломпы — традыцыйныя галандскія драўляныя чаравікі. У Нідэрландах вільготны марскі клімат, і, каб не прамачыць ногі, сяляне раней насілі такі абутак (скураны яны не маглі



Усе млыны ў Заансе Сханс — у рабочым стане.

сабе дазволіць). А зімой кломпы з тоўстай падэшвай добра абаранялі ад маразоў. Выраблялі чаравікі з асіны ці тапалі. Вядома, цяпер яны не такія папулярныя сярод насельніцтва, але некаторыя агароднікі і рыбакі дагэтуль у іх ходзяць.

Што пакаштаваць? Абавязкова паспытайце галандскі сыр. Класічны, з травамі, папрыкай, труфелем... Ва ўсіх фірмовых крамах дэгустацыя бясплатная. А ў некаторых ёсць нават музеі сыру. З цікавых фактаў пра мясцовую «малочку»: у Нідэрландах налічваецца 18 тысяч вытворцаў сыру, якія вырабляюць 660 мільёнаў кілаграмаў прадукту ў год! А «настойваецца» сыр на драўляных паліцах — ад чатырох тыдняў да двух гадоў. Чым старэйшы ўзрост, тым больш насычаны смак і высокі кошт.



Рыбацкая вёска Валендам.

Традыцыйны ласунак — вафлі. Калі бельгійскія тоўстыя і лёгкія, то галандскія — тонкія і хрусткія, з карамельнай праслойкай.

Папулярным фаст-фудам лічыцца... селядзец. Падаюць яго ў булачцы з цыбуляй і марынаванымі агуркамі, а прадаюць у асобных рыбных кіёсках. Галандцы таксама любяць бульбу фры.

**Многія гараджане не зашторваюцца, і, ідучы па вуліцы, можна выпадкова ўбачыць праз акно, як вячэрае звычайная галандская сям'я.**

### НЕ ЎРАЖАННЯМІ АДНЫМІ

Для беларусаў у Амстэрдаме дорага. Прадукты ў сярэднім каштуюць у два разы больш (за выключэннем веганскага і здаровага харчавання: соевае малако і мюслі тут часам нават таннейшыя, чым у Мінску). Вулічны фаст-фуд — той жа сэндвіч ці кулёк бульбы фры — прадаюць па тры-чатыры еўра. А гарачая страва ў кавярні (гарнір, мяса ці рыба і салата) абыдзецца мінімум у 10 еўра. Калі хочаце сэканоміць, гатовы абед у кантэйнеры можна купіць у супермаркеце: у залежнасці ад прадуктовага набору ён будзе каштаваць ад трох да сямі еўра.

Цана за адну паездку на грамадскім транспарце — тры еўра. Таму больш выгадна купляць праязны: на дзень ён абыдзецца ў 7,5 еўра, на два — у 12,5.

У Амстэрдаме прапануюць набыць турыстычную картку, якая ўключае ў сябе праезд на гарадскім транспарце, білеты ў музеі, экскурсію на лодцы па каналах і зніжкі ў некаторых установах. Такі абанемент на суткі каштуе 59 еўра, на двое — 74. Але, на мой погляд, у большасці выпадкаў у ім няма патрэбы. Так, уваход у папулярныя музеі тут абыдзецца нятанна, у 17—18 еўра, але наўрад ці за дзень у вас хопіць сіл і ўвагі наведаць больш за два.

Некалькі слоў пра жыллё. Ложак у пакоі на шэсць чалавек у хостэле паблізу цэнтра каштуе каля 25 еўра за ноч. За 60 можна знайсці нумар на дваіх, але гэта будзе на ўскрайку горада. Праўда, калі для вас важны камфорт, гэта неістотная пераплата. Тым больш грамадскі транспарт працуе ўсю ноч і дабрацца да сваёй гасцініцы зможаце ў любы час.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы формы 2РН, 2РП серии БЛ № 0711053 и по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БНК №№ 1200165, 1200168 **считать недействительными.**

УНП 100122726.

Утерянный полис страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» ОСГО ВТС серии ВВ № 6475940 **считать недействительным.**

Утерянное свидетельство о государственной регистрации ИП Пирог А. А., УНП 101296451, **считать недействительным.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** Ликвидатор ООО «Белтопгрупп» Колесников Марат Михайлович, 212030, г. Могилев, а/я 38, тел. +375(44) 719 44 14.

**Продавец:** ООО «Белтопгрупп», 222160, РБ, Минская область, г. Жодино, ул. Московская, д. 64Б, тел. +375(29) 607 06 60.

**Предмет аукциона: транспорт, (расположенный по адресу:** 222160, РБ, Минская область, г. Жодино, ул. Московская, д. 64Б).

| № лота | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона с НДС 10 % бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **1** | 5; 6 | **Легковой автомобиль № 1.** Марка, модель – NISSAN QASHQAI. Цвет – черный. Гос. номер – 4455 KH-5. Год выпуска – 2014. Номер кузова – SJNFBAJ11U1252908. **Легковой автомобиль № 2.** Марка, модель – NISSAN QASHQAI. Цвет – коричневый. Гос. номер – 4433 KH-5. Год выпуска – 2014. Номер кузова – SJNFBAJ11U1248635 | **56 582,40** | **5658,24** |

**Составные части, принадлежности, документы:** свидетельство о регистрации транспортных средств № OBA 193577; № OBA 193492.

**Сведения об обременениях:** залог, арест на рег. действия (Банк, Налоговый орган). Подробная информация по телефону +375 (44) 7194414, Колесников Марат Михайлович.

**Начальная цена с НДС 20 %: 56 582 руб. 40 коп.**

**Шаг аукциона: 5658 руб. 24 коп.**

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется с 10.00 до 15.00 во все дни недели, кроме субб. и воскр., по предварительному согласованию по тел. +375 (29) 607 06 60, Евгений Петрович.

**Задаток: 5658,24 (пять тысяч шестьсот пятьдесят восемь рублей, 24 копейки)** белорусского рубля.

Перечисляется на р/р/с BY53BPSB30121668620109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», ЦБУ № 501, БИК: BPSBBY2X. Получатель – ООО «Белтопгрупп», УНП 691713932. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ООО «Белтопгрупп», проводимом 23 января 2019 г.

**Срок подписания договора купли-продажи:** не позднее 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина Республики Беларусь от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение о задатке. Информацию о документах, необходимых для участия в аукционе, порядке его проведения, оформления результатов вы можете получить по телефону +375 (44) 7194414, Марат Михайлович.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи, в течение 5 дней со дня проведения торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Дата, место и время проведения аукциона: 23 января 2019 г. в 12.00,** 222160, РБ, Минская область, г. Жодино, ул. Московская, д. 64, БООО «Белтопгрупп».

**Дата, место и время окончания приема документов: 22 января 2019 г. до 15.00,** 212030, г. Могилев, а/я 38, Ликвидатор ООО «Белтопгрупп» – Колесников Марат Михайлович.

**Контакты: +375 (29) 607 06 60, +375 (44) 719 44 14**

## К публикации Коммунального топографо-геодезического унитарного предприятия «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле № 1-А/2019, который состоится 9 января 2018 г. (объявление опубликовано в газете «Звязда» 7 декабря 2018 г.) добавляются лоты № 3 и № 4 в следующей редакции

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, (лет) | Начальная стоимость, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Затраты на подготовку документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | В микрорайоне Энергетиков, 16 | 340100000005007402 | 0,0020 | Для размещения легкотипного торгового павильона | Органичений в использовании не имеет | 5 | 89,35 | 10,00 | 2 534,24 |
| 4 | В микрорайоне № 18 (позиция № 51 по генплану) | 340100000001006190 | 0,8342 | Для строительства многофункционального центра с паркингом на 300 машино-мест (для жителей микрорайона) | Охранная зона электрических сетей, сетей и сооружений водоснабжения, сетей и сооружений канализации, сетей и сооружений теплоснабжения | 5 | 148 334,21 | 7 450,00 | 3 113,53 |

Лоты № 3 и № 4 выставляются на аукцион повторно, извещения опубликованы 20.10.2018 г. и 28.06.2018 г. соответственно в газете «Звязда»

**Контактный телефон +375 232 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by** УНП 400230163

## Открытый аукцион № 60/18 по продаже офисных помещений в г. Минск

Организатор аукциона: ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс + 375 (17) 256-61-35

**Аукцион состоится 24.01.2018 в 11.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701.** Продавец – СООО «РЕСО-БелЛизинг»

| № лота | Предмет аукциона | Местонахождение | Площадь, кв. м | Начальная цена продажи долл. США с учетом НДС* | Сумма задатка по лоту, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| **1** | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708127293 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение). **ОФИС** | **г. Минск, ул. Ваупшасова, 10-159** | 177,5 | **124 250** | 15 000 |
| **2** | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708127294 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение). **ОФИС** | **г. Минск, ул. Ваупшасова, 10-160** | 128,3 | **89 810** | 10 000 |
| **3** | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708182415 (назначение – административное помещение, наименование – кабинеты с коридорами, кладовой и т. д.). **ОФИС** | **г. Минск, ул. Машиностроителей, 9А-1** | 264,1 | **118 845** | 14 000 |
| **4** | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708182420 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение). **ОФИС** | **г. Минск, ул. Машиностроителей, 9А-8** | 101,4 | **45 630** | 5 000 |

*расчеты за приобретаемое имущество производятся в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату заключения договора купли-продажи

| | |
|---|---|
| Порядок проведения и выбора победителя | Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия |
| Прием заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 21.01.2018 до 17.00** |
| Задаток | Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты:<br>– для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;<br>– для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22.<br>Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068.<br>Назначение платежа: «Задаток согласно Извещению о проведении аукциона №60/18 по лоту №__» |
| Затраты | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 60/18. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения |

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.
Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

**КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА, тел.: + 375 (17) 256-61-35 • + 375 (25) 549-86-22 – Игорь Садливский, auction@expertiza.by. Более подробную информацию и фото по объекту можно увидеть, посетив страницу http://www.expertiza.by**

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже имущества, обращенного в доход государства по Брестской области

| № лота | Наименование объекта / характеристика объекта | Местонахождение объекта / кадастровый номер участка | Начальная цена продажи, руб. До проведения уценки | После проведения уценки на 10 % | После проведения уценки на 20 % | После проведения уценки на 30 % | После проведения уценки на 40 % | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1**** | Капитальное строение с инвентарным № 100/С-84052 **(жилой дом)** площадью 48,8 кв. м, расположенное на земельном участке площадью 0,1835 га. Год постройки – до 1930 г. | 121285004101000047 Брестская обл., Брестский р-н, Чернинский с/с, д. Гутовичи, 7 | 4 428,00 | **3 985,20** | **3 542,40** | **3 099,60** | — | 300,00 |
| **2***** | Капитальное строение с инвентарным № 123/С-8700 **(одноэтажный, деревянный жилой дом)** площадью 57,4 кв. м, жилая площадь 19,1 кв. м, 1946 года постройки. (Составные части и принадлежности: *одноэтажный деревянный жилой дом, веранда, четыре сарая, колодец*) | 124386502601000028 Кобринский р-н, Тевельский с/с, д. Девятки, ул. Первомайская, д. 46 | 1 779,93 | **1 601,94** | **1 423,95** | **1 245,96** | **1 067,97** | 100,00 |
| **3**** | Капитальное строение с инвентарным № 123/С-20162 **(одноэтажный, кирпичный гараж №158)** площадью 27 кв. м | 124350100001004393 Брестская обл., Кобринский р-н, г. Кобрин, гаражный массив в районе ул. Свердлова, гараж № 158 | 2 862,00 | **2 575,80** | **2 289,60** | **2 003,40** | — | 200,00 |
| **4**** | Капитальное строение с инвентарным № 100/С-17511 **(гараж № 49)** площадью 19,3 кв. м. *Характеристика:* 1996 год постройки | 140100000001018940 г. Брест, ул. Красногвардейская, 125А/49, гараж № 49, блок 2 | 2 916,00 | **2 624,40** | **2 332,80** | **2 041,20** | — | 200,00 |
| **5*** | Капитальное строение с инвентарным № 100/С-59055 **(станция технического обслуживания автотранспорта)** площадью 1294,5 кв. м расположено на земельном участке площадью 1,2479 га | 121283004101000402 Брестская обл., Брестский р-н, д. Ковердяки, ул. Трудовая, 67Б/2 | 155 700,00 | **140 130,00** | — | — | — | 14 000,00 |
| **6*** | Капитальное строение с инвентарным № 100/С-28979 **(здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, склад запчастей)** площадью 539,4 кв. м, на земельном участке площадью 6,8144 га | 121200000001000373 г. Брест, ул. Катин Бор, 99Б/9 | 116 100,00 | **104 490,00** | — | — | — | 10 400,00 |
| **7*** | Изолированное помещение с инвентарным № 100/D-74103, площадью 1 870,0 кв. м, **(помещение культурно-просветительского и зрелищного назначения, изолированное помещение № 2)**. Год постройки – 1973 | г. Брест, ул. Московская, 202 | 1 214 100,00 | **1 092 690,00** | — | — | — | 109 000,00 |
| **8*** | Капитальное строение с инвентарным № 131/С-6743 **(здание неустановленного назначения, бытовой корпус)**, площадью 361,0 кв. м, расположенное на земельном участке площадью 8,1182 га. Год постройки – 1992 | 125851000003051 Брестская обл., Столинский р-н, Давид-городок, ул. Калинина, 68 | 24 408,00 | **21 967,20** | — | — | — | 2 190,00 |
| **9*** | Капитальное строение с инвентарным № 131/С-6814 **(здание, специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, здание деревообработки),** площадью 497,9 кв. м, расположенное на земельном участке площадью 8,1182 га. Год постройки – 1981 | 125851000003051 Брестская обл., Столинский р-н, Давид-городок, ул. Калинина, 68 | 32 724,00 | **29 451,60** | — | — | — | 2 940,00 |

*****повторные аукционные торги после проведения уценки на 40 % **повторные аукционные торги после проведения уценки на 30 % *повторные аукционные торги после проведения уценки на 10 %**

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью». Контактные телефоны: 53-81-92, 53-45-65. http:// bgcn.by; gki.gov.by; dha.gov.by**

**Аукцион состоится 22 января 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607 (либо актовый зал).**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 20.12.2018 г. до 16.15 16.01.2019 г. по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50**

**ПРИМЕЧАНИЕ:** порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63.

Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».

**При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, предоставляет:**

– копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

– документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица, и его паспорт;

– паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенная доверенность для представителя физического лица;

– заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающие внесение задатка в размере 10 % от начальной цены объекта;

– организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе);

– организациями и физическим лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на бел. (рус.) язык;

– представителями организаций и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Сумма задатка в размере до 10 % от начальной цены продажи перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код AKBBBY21100, УНП 290433924, в срок по 16.01.2019 г.**

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

– **в течение 3 рабочих дней** со дня проведения аукциона оплатить сумму в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

– **не позднее 20 рабочих дней** со дня подписания протокола о результатах аукциона оплатить стоимость приобретенного на аукционе объекта недвижимого имущества.

Победитель аукциона приобретает право собственности на недвижимое имущество в соответствии с законодательством.

**Земельный участок, на котором размещается недвижимое имущество, предоставляется победителю аукциона без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды земельного участка при его предоставлении в аренду.**

Друкуецца ў «Маладосці»

**«Міжкніжжа» — гэта новая рубрыка ў «Маладосці», спроба напісаць адзін твор, узяўшы за аснову ідэі, вобразы, сюжэт, а часам і стылістыку двух вядомых твораў: адзін са скарбніцы сусветнай літаратуры, другі — з беларускай. Неназваныя творы кожны раз новыя. Таму «Міжкніжжа» — гэта своеасаблівы іспыт, гульня, лабірынт, дзе Кафка сплятаецца з Купалам, Стральцоў — са Стопардам, але ніхто не кажа чытачу, што тут ад Кафкі, а што — ад Стопарда. Даводзіцца шукаць самому, знаходзіць апорныя словы, імёны, цытаты. Ці не знаходзіць. Калі знойдзеш, то атрымаеш дадатковае задавальненне і здзіўленне ад таго, што гэта можна сумяшчаць, што сцэны пакоя Грэгара Замзы — гэта адсутнасць сцэн сям'і Зяблікаў. Што... не будзем далей тлумачыць, каб не перашкаджаць чытачу атрымліваць сваю асалоду. Лепш скажам яшчэ, што «Міжкніжжа» — гэта самастойныя творы. Нават калі ў чытача не атрымаецца падабраць ключ і паглядзець, што там унутры, адкуль усе гэтыя складнікі, ён не застанецца з пустымі рукамі. Тэксты ў рубрыцы самадастатковыя, не абавязкова ставіцца да іх як да дзіўнага эксперымента. Гэта літаратура, створаная з літаратуры, што адкрывае новыя слаі, новыя разуменні. Часопіс «Маладосць» заўсёды спрабуе быць свежым і яркім. Такія праекты, як «Міжкніжжа», — сцвярджэнне, што ўсё атрымліваецца. Аўтар ідэі «Міжкніжжа» і яго тэкстаў — Марына Яромка. Прапануем чытачам «Чырвонкі. Чырвонай змены» адзін з узораў яе творчасці.**



Марына ЯРОМКА.

# ГОНАР У ГЛІНЕ З АГНЮ

ПАД цёмнай навіссю броваў ажылі нарэшце вочы. Ён глядзіць наўпрост на зондэрфюрара, але словы разбірае толькі ў паўторах збялелай перакладчыцы, што не адыходзіць ні на крок ад свайго цяперашняга гаспадара. Яго ўспомнілі і пазналі. Ці не лепш быць між лістоў нябачным лістом? Ён ведае, што агонь, які хутка загарыцца, будзе знішчаць бязлітасна і дашчэнту. Смерць падышла, каб дамовіцца пра канец, пра апошняе словы, пра кропку.

Ён не чуе вакол ніводнага імені, бо ніхто нікога не аклікае і ніхто не называе сябе. Яго, печніка з імем Пячнік, падагналі па загадзе. З ім гаворыць, ён спрабуе варушыць бяскроўнымі вуснамі ў адказ. М., чыё імя ведалі ў Калхідзе, Карынфе, Іолку, Афінах і ўсюды, дакуль даляцелі праклёны Ясона, перарвала смех болем, бо смех пахне воблакам, а боль знявагі — пылам. Пячнік слухае крывое падабенства размовы і глядзіць на боты зондэрфюрара, якія не могуць блішчаць на сонцы.

Ён спрабуе слухаць прапанову, але збіваецца, не можа разабрацца, хто з ім гаворыць. Цягнік узарваны, дзяцей, суседзяў, сваякоў больш не называюць дзецьмі, суседзямі і сваякамі — называюць бандай і адкрываюць уваход у агонь. М. развіталася з домам, пакінуўшы на ўспамін забойства, паверыўшы ў жыццё, дзе пра яе пачуюць. Яе зняважылі, бо з чужаземкай можна жыць, але нельга памерці. З М. маглі б пасмяяцца, але яна ведала, што музыкі на банкеце незаўважныя, што яе розум патрэбны не для перамог, а дзеля таго, каб сысці пасля паражэння. Пячнік назірае за небам, сонцам і аблокамі, якія хутка скончацца. Схаваная ў скуру зброя дае перавагу ў словах, моўчкі малюючы мяжу часу.

Ён умее рабіць печы, якія ўсе хваляць за цеплыню. Ён цудоўна ведае, што холад выганяецца не толькі агнём, які бачыць кожны, бо той кідаецца ў вочы. Пячнік старанна абгладжвае гліну, каб трымалася, каб не трэскалася, бо не будзе чаму грэцца. М. паабяцалі дарункі, услаўленага мужа, узнагароды за дапамогу, каб яна магла разводзіць ахвярныя вогнішчы ў самых багатых храмах. Але абяцанні скончыліся, і М. зразумела, што ахвяры перасталі мець значэнне, бо яна сама каштуе менш за падпаленае ягня. Ёй далі жыццё ў абмен на гонар, пакінуўшы гарэць на адкрытым паветры. Пячнік ведае, што агонь трымаецца дзякуючы гліне, што гліна стварае сценку, форму, мяжу, якую ён, пячнік, не мае права парушыць.

Зондэрфюрар прапануе ратунак за добра зробленую печ. Пячнік улоўлівае пах воблака. Ён не хоча гаварыць, не мае надзеі на словы, бо той, хто стаіць са зброяй пад скурай, прымушае Печніка звальвацца на вышыню ботаў. М. прагнула помсты. Клітэмнестра заплаціла забойствам за забойства. Ясон не забіў нікога з тых, за каго можна помсціць, Ясон зняважыў. Помста — спосаб памяняцца вопраткай, дзе ролі прыдумляе адзін, а пераапрануцца прымушае іншы, пакрыўджаны. Яна паклялася Гекатай і, вяртаючы гонар, забрала чужы. Словы паміж рознымі вуснамі магчымыя, калі вочы знаходзяцца на аднолькавай адлегласці ад пылу і неба. Знішчаць, ператвораць у едкі дым. Пячнік ведае, што гліна жыве даўжэй за агонь.

На сваё жыццё лёгка пагадзіцца. Кожны гатовы сказаць «так», але не кожнаму даюць слова. Ён думае пра тых, каго вядуць у вялікі агонь, каб назаўсёды пазбавіць тонкага святла ўнутры. Слабы або мёртвы. Выратаваць жонку, адабраць у вогнішча іскру. Дзве іскры патухнуць без печы. Ад таго, на што лёгка пагадзіцца, не так цяжка і адмовіцца, калі ёсць сэнс у апошнім сполаху іскры. М. не хацела помсціць напалову, бо прывыкла адплачваць удвая. Боль мусіў вярнуцца болем, які немагчыма перамагчы сілай, лекамі, словамі. М. ведала, што самы страшны боль — той, які не кранаецца скуры, а свярбіць унутры галавы і вылятае ў пыл праз вочы. Вырваць з корнем Ясонаў дом: ён разбурыў сям'ю, М. прымусіла яго згуляць па ролях. Пячнік гатовы ўзяць жыццё, забраўшы ўсе жывыя іскры ад агню забойцаў, бо без маленькага святла не разгледзіш трэшчыны ў сценцы печы. Гліна не ўтрымаецца на згодзе без пакуты.

Над неблiскучымі ботамі няма страху смерці, які прымушае памятаць пра моц агню. Забіць усіх можна без страху і разумення, бо ўсе ніжэйшыя за пыл. Пячнік чапляецца за трэшчыну людскасці, каб выраўняць вышыню вачэй. Каб падняцца, патрэбны штуршок, патрэбныя сілы. Пах воблака просіць у водкуп жыццё. М. не задаволілася праклёнамі, ёй не хапіла ўласнага крыку. Смерць не прыйшла на покліч, таму мусіла адгукнуцца на загад. Зняважаны гонар раздзіраў знутры, шукаючы выйсця. Помста для ўтаймавання. Помсце патрэбныя выканальнікі роляў, якія ператвараюць скаргі ў боль, чужы боль пад чужой скурай. Пячнік унюхваецца ў словы смерці. Агонь патухне для кожнага вока, калі трэшчына разыдзецца ўшчэнт.

Кожнага забіць складана. Зондэрфюрар непрыемна моршчыцца ад крыкаў і стогнаў. Пячнік маўчаннем выцягвае з яго словы, якія праз пераклад збялелай падначаленай складаюцца ў пагардлівыя да адказаў прапановы. Пячнік чакае, пакуль стогны атрымаюць імя, пакуль лямант усіх перастворыцца ў крык кожнага, і тады ён зробіць тое, што нагадае пра іскры. М. не мела зброі, не мела войска і караблёў, каб адказаць на крыўду. Мужчыны забралі сабе цвёрдыя і заўважныя прылады для забойства і прысвяцілі іх свайму богу. М. дала клятву. У вайне зашмат стрэлаў, ёй хапіла чатырох, М. разумела, што перавагу дае дакладна пастаўленая кропка. Без сценак з гліны маленькі агонь вырастае да магутнага вогнішча. Але вецер. Але дождж. Але нічыйнасць. Пячнік захоўвае цеплыню іскры ва ўважліва загладжанай гліне.

Сваёй смерці мала, каб знішчыць пах воблака. Трэшчыну не ўтрымае адмаўленне ад аднаго жыцця. Пячнік мусіць забіць кожнага, чыё імя мог ці не мог уратаваць ад пылу. Пячнік умацоўвае гліну, кідаючы іскры ў агонь. М. апрыкрала жыццё, але смерць не магла дапамагчы ў пераапрананні. Смерць засталася б смерцю, забыццём памяці, вызваленнем ад будучыні. М. абрала багіню для прынясення ахвяры. Помста чакала закладання жыцця, схаваўшы сярод старой вопраткі гонар, забраны адным з галоўных герояў гульні. Дзеля пераапранання мусіла загінуць жыццё, якое нічога не ведала пра правілы змены роляў. Позірк цвярдзее разам з глінай, калі Пячнік адчувае, як вочы над ботамі спаўзаюць з-пад воблака ўніз, бліжэй да крыкаў, едкага дыму, ажылых вачэй.

Ён разварочваецца і ідзе прэч з большай упэўненасцю, чым ішоў да запыленых ботаў. Ён выракае на смерць тых, каму не далі слова, бо словы не маюць значэння, калі складаюцца ў бязглуздыя пытанні. Ён раздражнае зброю пад скурай. Чалавек з імем Чалавек. М. забіла ўладара горада і яго дачку, але гэтага было мала. М. пракляла Ясона і пачала гульню дзеля яго. М. вырашыла рассячы кожную вяроўку, па якой ён мог уцячы ад пажару смяротнага болю. Знішчыць усё, што нагадвала пра памылку, знішчыць падман, знішчыць ашуканую частку сябе. М. забіла тых, каму аддала калісьці сонца, і памерла сама, аддаўшы сонца новаму чалавеку ў новым горадзе. Чалавека закідваюць у вялікі агонь мёртвым, яго іскра патухла, але паспела высушыць залепленую трэшчыну. Ён гіне іначай, не так, як тыя, каго ён мог уратаваць, гіне не так, бо пацвяліў пах воблака дымам, раззлаваў зброю ўвагай да гліны і пагардай да кволага агню.

І ён жыве, загладзіўшы трэснутую сценку печы, М. прымусіла пераапрануцца, музыкаў слухалі б на апошніх перамовах, забіла маці сваіх дзяцей, агонь паглынае тонкае святло, чалавек з імем Чалавек, словы без толку, памятай пра гліну ў апошняй кропцы.

Гэта шанц!

# ЯКОЙ ТАБЕ БАЧЫЦЦА ЕЎРОПА-2050?

**Падзяліцца сваім меркаваннем наконт таго, якой можа быць Еўропа праз тры дзясяткі гадоў, запрашаюць усіх еўрапейцаў. Як мінімум пяць удзельнікаў выйграюць 500 еўра і будуць запрошаны на міжнародны семінар з еўрапейскімі лідарамі меркаванняў з аплатай усіх выдаткаў. Imagine Europe — гэта конкурс ідэй, які падтрымліваецца некалькімі еўрапейскімі партнёрамі і займеў фінансавую падтрымку ў рамках праграмы Еўрапейскага саюза Erasmus+.**

Можна як прэзентаваць агульнае бачанне Еўропы ў 2050 годзе, так і выбраць канкрэтную сферу для больш глыбокага аналізу: гэта можа быць камунікацыя паміж людзьмі, змяненне клімату, ахова навакольнага асяроддзя, адукацыя, здароўе, дэмакратыя, міграцыя, сацыяльная палітыка, штучны інтэлект, генная інжынерыя і г. д.

Мэта — падштурхнуць людзей падумаць над рашэннем важных сусветных і еўрапейскіх праблем, натхніць іх на актыўнасць у еўрапейскай грамадскай прасторы, даць моладзі магчымасць папрактыкаваць свае пісьмовыя, прамоўніцкія і прэзентацыйныя навыкі.

Конкурсныя работы прымаюцца ў фармаце кароткага тэксту (да 500 слоў) і відэа. Вы можаце зачытаць свой тэкст на відэа самі або папрасіць зрабіць гэта за вас іншага чалавека. У конкурсных работах дапускаецца любая мова, але з адным важным нюансам: калі гэта будзе не англійская, трэба будзе зрабіць на ёй субцітры да відэа. Відэаролік павінен доўжыцца максімум тры хвіліны. Тэкст і відэа трэба адправіць на інтэрнэт-старонку http://www.imagineeurope.eu/participate.

Тэрміны падачы матэрыялаў — да 28 лютага 2019 года. Анлайн-галасаванне за найлепшыя ролікі будзе адкрыта да 25 сакавіка. Таксама сваё меркаванне агучаць журы. Прэзентацыі фіналістаў будуць вынесены на фінальнае публічнае галасаванне, якое пройдзе ў розных краінах Еўропы з красавіка па чэрвень 2019 года. «Вага» галасоў будзе падзелена наступным чынам: анлайн-галасаванне — 20 %, грамадскае галасаванне — 40 % і меркаванне журы — 40 %. Пераможцы будуць абвешчаны ў канцы чэрвеня наступнага года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

SEX=БАЛЯСЫ

# ЗАЦІКАВІЦЬ САБОЙ

**Нядаўна на адным з сайтаў прачытаў разважанні маладога мінчаніна пра сябе і час: пра памкненні хлопца і яго равеснікаў (такія часам розныя), мары і жаданне ўвасобіць іх у жыццё. («— Ты, калі вырасцеш, кім хочаш працаваць? — Ты вось зараз столькі непрыемных слоў нагаварыў...») Пра тыя магчымасці, якімі можна скарыстацца, каб дасягнуць мэты. («— І запомні, сынок! Ніколі не звязвайся з дрэннымі кампаніямі. Там і заробкі маленькія, і начальнікі — ідыёты!») Апроч іншага, запомніліся словы хлопца пра тое, што, калі дзяўчатам сказаць, што ты — электраманцёр з завода, тыя неяк адразу губляюць цікаўнасць. («Сем гадоў таму я прапанаваў дзяўчыне сваёй мары сустракацца, сёння я спытаў яе, ці выйдзе яна за мяне замуж. Яна адмовіла абодва разы».) А вось калі прадставіцца кіраўніком стартапа — рэакцыя зусім процілеглая. («Ніколі не адмаўляйцеся ад дарагіх падарункаў. Каханне прыходзіць і сыходзіць, а ламбард працуе заўсёды».)**

Хаця гаворка ў абодвух выпадках ідзе пра аднаго і таго ж чалавека. Толькі, як заўважыў суразмоўнік, у рознай «абгортцы». («Падумалася, што ў сучасных рэаліях радок «вось мілы мой з'ехаў, не вернецца, пакінуў толькі картачку сваю» гучыць не так ужо і дрэнна».) І неяк адразу прыгадаўся вядомы савецкі фільм «Масква слязам не верыць». Пры такім падыходзе, як у сітуацыі з мінчанінам, галоўныя героі і не пазнаёміліся б нават. Памятаеце? «Ты хоць бы сказаў, як цябе завуць. — Гога. — Як??? — Можна Гоша. — Значыцца, Гога... Толькі гэтага мне не хапала....» «РаманЬцызЬму няма», — казаў герой адной з навел камедыі «Не можа быць!». Што, сапраўды так?



Ды не, вось вам іншая гісторыя знаёмства, пра якую таксама нядаўна пісалі. У Дзень без аўтамабіля ў сталіцы праводзіўся велапрабег. Перад ім хлопец усміхнуўся дзяўчыне, яны разгаварыліся. («Дзяўчаты, мужчын трэба шукаць не на сайтах знаёмстваў, а на парталах па працаўладкаванні. Пытанні тыя ж самыя, толькі фатаграфіі і рэзюмэ ў іх рэальныя».) Малады чалавек угаварыў новую знаёмую паўдзельнічаць у мерапрыемстве, хаця тая дрэнна каталася. І вось падчас велапрабегу дзяўчына ўлятае ў бардзюр... Хлопец спяшаецца ёй на дапамогу і таксама «вылятае» з веласіпеда... Выклікаюць хуткую дапамогу... Пасля размовы з урачамі малады чалавек раптам дастае (???) заручальны пярсцёнак: «Да вяселля зажыве! Выходзь за мяне замуж!» («Вельмі небяспечна атрымаць траўму пасля вяселля. Ужо не зажыве...») І дзяўчына пагаджаецца! (З таго ж фільма «Не можа быць!»: «— Падумаеш, тры дні знаёмыя. — Не тры — чатыры!») Пісалі, што гісторыя знаёмства бацькоў дзяўчыны ў многім падобная на яе выпадак. Будучая маці выбралася на каток з сяброўкай, хаця не вельмі доўга трымалася на каньках. Будучы бацька падышоў пазнаёміцца з ёй і прапанаваў навучыць катацца. Дзяўчына ўпала і зламала нагу. Малады чалавек пачаў яе наведваць і ў выніку яны пажаніліся. («— Мы сустракаемся з табой ужо паўгода. І ў мяне паняволі ўзнікла пытанне... Ты сапраўды хочаш варыць мне боршч, прасаваць кашулі, мыць шкарпэткі? — Гэта ты мне зараз прапанову робіш?») На жаль, працягу гісторыі не знайшоў. Спадзяюся, у маладых людзей усё склалася добра. («Спатканне з прыгожай жанчынай «упустую» прайсці не можа: пры любым раскладзе ў вас застанецца прыбраная кватэра».) Так што ўсё сапраўды залежыць ад саміх людзей, іх здольнасці разглядзець нешта важнае ў іншым чалавеку. («Купіў новыя шыны, а жонка нічога не сказала. Мабыць, у яе нехта з'явіўся».) І рамантыкі, як відаць, таксама не перавяліся. Нават у наш тэхналагічны час.

Ведаеце ж гісторыю канадскага студэнта, які пазнаёміўся ў бары з дзяўчынай па імені Ніколь, але высветлілася, што яна дала яму няправільны нумар. («Бывае, чакаеш Веру, Надзею, Любоў... А тут бац, і Танька прыйшла!») І тады малады чалавек, каб знайсці каханую, разаслаў пісьмы сотням адрасатаў з імем Ніколь — ад першакурсніц да прафесараў. («Жаночая рулетка: набіраеш паведамленне «я сумую», адпраўляеш усім былым і чакаеш, дзе стрэліць».) Па словах студэнта, ён адважыўся на масавую рассылку, бо не хацеў, каб Ніколь падумала, што ён — дрэнны хлопец, які не напісаў дзяўчыне. («Яна закахалася ў яго, бо ён быў стройным і маўклівым... А ён проста не мог гаварыць і ўцягваць жывот адначасова...») «Калі ваша імя Ніколь, вы з Галандыі і лічыце, што Ніцшэ прыгнятае, тады напішыце мне», — пазначыў у паведамленні канадзец. (Усё з той жа крыніцы — фільма «Не можа быць!»: «Не, не тут. Там сабакі не было. Мамаша была, папаша быў, а сабакі не было!») Сярод адрасатаў не аказалася патрэбнай Ніколь, аднак адна з дзяўчат, якая атрымала ад хлопца пісьмо, вырашыла дапамагчы студэнту і стварыла ў сеціве групу па пошуку каханай. («— Коля, я ўжо напалову дамовіўся аб спатканні вунь з той прыгажуняй. — Гэта як — «напалову»? — Ну, я згодны».) У выніку гісторыя атрымала шырокую агалоску і патрэбная Ніколь выйшла на сувязь! А вы кажаце — электраманцёр з завода...

Таму напрыканцы ўсім, хто хоча пазнаёміцца ці ўжо пазнаёміўся. «...У горы і ў радасці, у хваробе і ў здароўі, анлайн і афлайн».

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «ІДЭАЛЬНЫ ДЗЕНЬ — ТРЭНІРОВАЧНЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**— Аргенціна геаграфічна і культурна даволі далёкая ад нас краіна. Што здзівіла там больш за ўсё?**

— Як ні дзіўна, асабліва нічога. Уразілі цырымоніі адкрыцця і закрыцця, яны былі зроблены вельмі прыгожа і эфектна, ніколі раней такога не бачыў. Звярнуў увагу, што ў іх вельмі шмат людзей шпацыруюць па галоўнай пешаходнай вуліцы горада і там часта можна сустрэць асоб, якія... мяняюць грошы. Кажуць, у нас такое было ў 1990-я, а ў іх гэта засталося да гэтага часу.

**— На цябе ўсклалі гонар быць капітанам нашай каманды і сцяганосцам. Гэта дадавала адказнасці і нейкіх абавязкаў?**

— Тое, што выбар выпаў менавіта на мяне, было нечаканым, але я ўзрадаваўся. Вельмі хвалююча было выносіць сцяг краіны на цырымоніі адкрыцця. А што датычыцца абавязкаў капітана, іх асабліва не адчуў.

**— Пяройдзем да спорту. На Юнацкіх Алімпійскіх гульнях ты заваяваў сярэбраную ўзнагароду, ці задаволены вынікам?**

— Наогул, не думаў, што траплю «ў прызы» на гэтым турніры, планаваў быць у фінале А, таму што нядрэнна выступаю на дыстанцыі 500 метраў. Але потым пачаў глядзець на вынікі іншых спартсменаў і зразумеў, што магу пазмагацца за медалі. У паўфінале, акрамя супернікаў, мне давялося пераадольваць яшчэ і хвалі, гэта вельмі раззлавала, і менавіта злосць дапамагла заваяваць «серабро». У фінале за перамогу змагаўся з украінцам, ён адарваўся ад самага старту, я стараўся дагнаць, думаў толькі пра адно — як бы мацней адштурхнуцца. Ужо нічога не адчуваў, толькі пазіраў на саперніка. Нават на нейкі момант стаў яго апярэджваць, але да «золата» мне не хапіла долі секунды, было вельмі крыўдна.

**«Мне адзіночка падабаецца больш, праўда, ёсць мінус: калі сварацца, то толькі на цябе аднаго».**

**— Перад Гульнямі на юнацкім чэмпіянаце Еўропы ты таксама стаў другім...**

— Гэта быў мой першы чэмпіянат Еўропы, я наогул не чакаў, што змагу трапіць у фінал і падняцца на п'едэстал, таму і другому месцу быў вельмі рады. Пасля фінішу мяне накрылі выбуховыя пачуцці.

**— Наколькі ведаю, ты выбраў веславанне не адразу...**

— Так, з шасці гадоў займаўся плаваннем, тады мы з бацькамі жылі ў Шклове, але з-за некаторых абставін давялося пераехаць у Мінск. Прыйшоў у секцыю, але там не аказалася месцаў. Пазней у маю школу завітаў трэнер па веславанні, выклікалі высокіх хлопцаў, мяне ў тым ліку. Я падумаў, чаму б і не, і пайшоў на трэніроўку.




**— Плаванне дапамагло ў веславанні? Многія пачаткоўцы, якія займаюцца гэтым відам спорту, напачатку перакульваюцца ў ваду...**

— Нікому не хочацца быць мокрым, але я нават і не думаў, што ўпаду. Спачатку плаваў у двойцы і чацвёрцы, дзесьці толькі праз год паспрабаваў сесці ў лодку адзін і з таго часу выступаю толькі ў гэтым класе. Мне адзіночка падабаецца больш, праўда, ёсць мінус: калі сварацца, то толькі на цябе аднаго *(усміхаецца)*. Пакуль трэнеры не могуць падабраць мне партнёра, бо тут трэба ўлічваць мае антрапаметрычныя даныя і хуткасць, якую я паказваю на вадзе.

**— Як паставіліся бацькі да таго, што ты абраў спорт у якасці сваёй прафесіі?**

— Калі толькі пачынаў займацца, проста хадзіў, трэніраваўся, часам наогул нічога не рабіў, не разумеў нават, навошта мне гэта. А потым, калі прыйшлі першыя вынікі, мяне аддалі да трэнера, з якім я працую і цяпер, — Канстанціна Паўлавіча Кікіна. Ён строгі, дасведчаны спецыяліст, з ім я пачаў паказваць усё вышэйшыя вынікі і спорт стаў прафесіяй.

**— Веславанне — адзін з самых складаных відаў спорту, ніколі не хацелася ўсё кінуць?**

— Не. Бывае вельмі цяжка, але, каб чагосьці дамагчыся, трэба ўвесь час працаваць. Хоць адпачынак таксама важны, арганізм не можа пастаянна быць на мяжы магчымасцяў.

**— Што цябе матывуе на штодзённыя трэніроўкі?**

— Жаданне паказаць максімальны вынік. Каб калі-небудзь выступіць на Алімпійскіх гульнях і заняць там прызавое месца.

**— Што б ты назваў самым складаным у спорце высокіх дасягненняў?**

— Сабрацца і не кінуць. Псіхалагічна трымацца, маральна. Гэта важна і падчас адной канкрэтнай гонкі, і на працягу ўсёй спартыўнай кар'еры. Бываюць цяжкія дні, зборы, асабліва калі цябе рыхтуюць да чэмпіянату Еўропы ці свету. Не хочацца трэніравацца зусім, думаеш, вось бы тыдзень адпачыць, але разумееш, што гэты тыдзень потым прыйдзецца кампенсаваць упартай працай цэлы месяц.

**— З кім з вядомых спартсменаў хацеў бы паспаборнічаць?**

— Калі з беларусаў, то з Дзянісам Мігалем, а з сусветных зорак, вядома, з новазеландцам Робертам Мэнсанам. Калі казаць наогул пра спартсменаў, якія мяне ўражваюць, якіх можна назваць легендай, то з беларусаў гэта Кацярына Карстэн, яна вялікая, пабывала на стольких Алімпіядах... З сусветных — Махэ Драйсдэйл. Неяк у адным з інтэрв'ю ён сказаў, што вельмі моцна хварэў. Урачы папярэджвалі, што можа памерці ў любы момант, але ён усё роўна працягваў трэніравацца.

**— Якую адукацыю плануеш атрымаць?**

— Пакуль хаджу на курсы, думаю паступаць у БДУФК на трэнера.

**—Чым любіш займацца ў вольны час?**

— Магу схадзіць у залу, падкачацца, горш ад гэтага не будзе. У камп'ютары пасядзець, пагуляць або фільмы паглядзець. Дарэчы, з апошніх мяне ўразіў «Веном», а наогул я аддаю перавагу фантастыцы або навуковай фантастыцы.

**— Як ты ўяўляеш свой ідэальны дзень?**

— Ён дакладна будзе трэніровачным, таму што на выхадных часта няма чым заняцца. Я б хацеў добра выспацца, устаць гатовым ісці на трэніроўку і адпрацаваць на максімуме.

**—- Калі б была магчымасць удасканаліць сябе, якую якасць дадаў бы сабе?**

— Неверагодную цягавітасць.

**— Якім бачыш сябе праз дзесяць гадоў?**

— Я па-ранейшаму буду ў спорце. У мяне будзе кватэра, можа быць жонка, але гэта не дакладна *(усміхаецца)*. У плане прафесіі я б хацеў быць ужо майстрам спорту міжнароднага класа, магчыма пераможцам Алімпіяды.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 19.12.2018 г.

# ТВОРЧАСЦЬ ПЛЮС

## Натхняючыся Караткевічам

**Помнік, прататыпам якога паслужыў пісьменнік Уладзімір Караткевіч у юнацтве, стаў неад'емнай часткай культурнай прасторы прадзюсарскага цэнтра «Спамаш», — новы творчы дом адкрылі напярэдадні 15-годдзя ўстановы.**

Насамрэч скульптурная кампазіцыя «Прысвячэнне паэту» работы вядомага майстра Уладзіміра Слабодчыкава з'явілася ў сталічным раёне Асмалоўка яшчэ год таму. За гэты час бронзавы хлопец, падобны да Уладзіміра Караткевіча ў юныя гады, стаў добрым сябрам і крыніцай натхнення для больш чым 60 дзяцей і падлеткаў — столькі іх на сёння займаюцца ў творчых студыях прадзюсарскага цэнтра, дзверы ў які расчыняюцца літаральна праз некалькі крокаў. У чым адметнасць, і чаму гэты апавед не рэклама? Бо гаворка пра той рэдкі выпадак, калі бізнес не на словах, а на справе ўзяў пад крыло мастацтва: і помнік, і ўпісаны ў гістарычны раён сучасны чатырохпавярховы будынак узведзены цалкам за кошт сродкаў кампаніі «Амкадор». І, як сціпла заўважае яе кіраўнік, адзін з самых уплывовых айчынных бізнесменаў **Аляксандр ШАКУЦІН**, тут усё зроблена для таго, каб не толькі раскрыць дзіцячыя таленты і вырасціць з іх артыстаў як мінімум еўрапейскага ўзроўню, але і каб гэтыя артысты не «ішлі на экспарт», а заставаліся беларускімі і садзейнічалі развіццю нашай культуры.

На адкрыцці новай творчай прасторы прысутнічаў таксама **міністр культуры Юрый БОНДАР,** які падзякаваў педагогам і выхаванцам прадзюсарскага цэнтра высокага творчага палёту. «Безумоўна, у творчага дома, створанага камандай аднадумцаў, вялікія перспектывы. Тут будуць развівацца таленавітыя дзеці і творчая моладзь, работа з якой будзе весціся на сістэмнай аснове. Цэнтр стане месцам прыцягнення маладых талентаў, якія вырашылі прысвяціць жыццё мастацтву, нашай культуры», — дадаў міністр.

Нагадаем, пустуючую двухпавярхоўку на вуліцы Камуністычнай гарадскія ўлады аддалі пад будынак прадзюсарскага цэнтра яшчэ ў 2014 годзе, аднак тэрміны здачы аб'екта зацягнуліся, бо замест рэканструкцыі давялося фактычна весці будаўніцтва нанова. Летась будынак звонку быў гатовы, але спатрэбіўся яшчэ даволі працяглы час для аддзелачных «начыння», і кропка ў маштабным праекце была пастаўлена толькі сёлета.

Як адзначыла **дырэктар цэнтра Анжэліна МІКУЛЬСКАЯ,** у Год малой радзімы тут фактычна адбылося рэфарфарматаванне, пераход да новых відаў дзейнасці. «Падобнага цэнтра ў нашай краіне яшчэ не было, таму гэта даволі смелы эксперымент, нягледзячы на багаты вопыт



**Міністр культуры Беларусі Юрый БОНДАР, дырэктар ПЦ «Спамаш» Анжэліна МІКУЛЬСКАЯ і намеснік старшыні Мінгарвыканкама Ігар ЮРКЕВІЧ на адкрыцці новай культурнай прасторы.**



**Аляксандр ШАКУЦІН падтрымаў традыцыю, якую распачалі выхаванцы цэнтра: ідучы на заняткі, паціскаць руку скульптуры.**

Фота БелТА.

работы. Цяпер у нас будзе поўны цыкл вырошчвання прафесійных артыстаў, пачынаючы ад дзіцячай студыі і заканчваючы гуказапісной, таксама з'явіцца магчымасць рэалізаваць свае творчыя ідэі ў кампазітараў і паэтаў, аранжыроўшчыкаў — магчымасці цэнтра дазваляюць замахвацца на многае». Ужо гэтай восенню «Спамаш», які працуе з 2004 года і раней займаўся раскруткай і падтрымкай толькі некалькіх маладых выканаўцаў (сярод іх у розны час былі, напрыклад, Дарыя, Іван Буслай, Аня Шаркунова, Віталь Гардзей, Герман, Аляксей Грос, Алена Ланская) набраў выхаванцаў у творчыя студыі. Надалей тут плануюць праводзіць кастынгі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі і рыхтаваць таленавітых дзяцей да выхаду на вялікую сцэну — а значыць, у нашай краіне нарэшце з'явілася альтэрнатыва Акадэміі эстрады Ігара Крутога і іншым замежным творчым школам.

На сёння ў прадзюсарскім цэнтры — шэсць падраздзяленняў, сярод якіх студыя мастацтваў Malinovka by Spamash, студыя гуказапісу, рэжысёрская, харэаграфічная... Месца пад сонцам ім усім хапае, бо чатырохпавярховы комплекс уключае класы для заняткаў вакалам і музыкай, харэаграфічную залу, адміністрацыйныя памяшканні і самую сучасную ў краіне гуказапісную студыю. Яе, дарэчы, паслелі ўжо ацаніць такія вядомыя ў музыцы асобы, як Ганс Цымер (кампазітар, аўтар музыкі да папулярных фільмаў, сярод якіх «Піраты Карыбскага мора», «Цёмны рыцар», «Кароль леў» і дзясяткі іншых) і экс-саліст Deep Purple Джо Лін Цёрнэр, які, дарэчы, рыхтуе сумесную работу з выхаванцамі беларускага прадзюсарскага цэнтра. Акрамя таго, менавіта ў студыі ПЦ «Спамаш» запісваецца песня да цырымоніі адкрыцця II Еўрапейскіх гульняў, і яго ж каманда рыхтуе цырымонію сустрэчы Агню міру ў рамках Гульняў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Слоўніца

### Праблемы перакладу

# СВЯТОЕ ПІСАННЕ ПА-БЕЛАРУСКУ

**Беларусы — адзін з першых народаў, якія атрымаў Біблію на роднай мове. Францыск Скарына пераклаў яе, калі яшчэ не існавала англамоўных друкаваных выданняў Пісання. Сёння мы маем ужо 18 беларускіх перакладаў Новага Запавету, і гэта без уліку асобных біблейных кніг, якія выйшлі ў свет на нашай мове.**

**І тым не менш праца над Біблія на беларускай мове ўсё яшчэ працягваецца. Ці з'явіцца ў нас адзіны пераклад, які прымуць прадстаўнікі розных канфесій? Як падаваць Біблію сучасным чытачам? Якія тэрміны з яе трэба ўводзіць у беларускія слоўнікі? І на што абапірацца пры стварэнні сучаснага перакладу, калі беларуская мова не задзейнічана не толькі ў царкве, але і ў многіх іншых сферах? Пра гэта адбылася зацікаўленая размова спецыялістаў у Нацыянальнай бібліятэцы.**

Біблію чалавецтва ўсё яшчэ працягвае адкрываць, невыпадкова яе назвалі «жывой кнігай». «Практыка іншых краін, дзе Святое Пісанне перакладаецца рэгулярна, паказвае, што чым большая колькасць якасных перакладаў, тым большая магчымасць у спажыўца мовы наблізіцца да разумення Біблії. Кожны новы пераклад будзе іншы, і гэта чарговы скарб, — заўважае **доктар сакральнай тэалогіі, біблеіст Ірына ДУБЯНЕЦКАЯ.** — Біблію не трэба перапісваць, яе трэба перачытваць. На маю думку, ідэальны пераклад для XXI стагоддзя павінен патлумачыць сучаснаму чытачу тое, што мог зразумець чалавек у старажытныя часы. Для гэтага абавязкова патрэбны каментарыі, важна паспрабаваць актуалізаваць тэкст, які быў напісаны ў першым тысячагоддзі да нашай эры».

Многія даследчыкі ўпэўненыя, што Святое Пісанне трэба перакладаць менавіта з арыгінала, тым больш што людзі, якія валодаюць старажытнымі мовамі, могуць адкрываць новыя словы і іх значэнні. Але, на жаль, сёння старыя мовы не запатрабаваныя, той жа іўрыт перастае выкладацца не толькі ў Беларусі, але і ў многіх замежных універсітэтах. Калі ж пры стварэнні Біблії па-беларуску выкарыстоўваць ужо існуючыя пераклады, можна не толькі скапіяваць чужыя памылкі, але і нарабіць сваіх. Тым больш што перакладчыкі сутыкнуліся з шэрагам праблем. Напрыклад, ім трэба было вырашаць, як падаць назвы раслін, музычных інструментаў, прадметаў штодзённага побыту, пра якія згадваецца ў «жывой кнізе», але сёння цяжка альбо наогул немагчыма ўявіць, як яны выглядалі.

Пры стварэнні беларускай Біблії важна максімальна перадаць не толькі яе змест. У кожнага евангеліста непаўторны стыль, свая манера аповеду. Бясспрэчна, каб захаваць жанравыя прыкметы, падаць вершы з «Кніг кніг», да працы над сучаснымі выданнямі неабходна далучаць і літаратараў, паэтаў. «Трэба максімальна перадаць усё, што ёсць у Біблії, у тым ліку і яе паэтычнае харастэва. Слова Божае не даходзіць да сэрцаў, калі яно не выказана так, як у Біблії, у адзіна магчымай форме», — упэўнена **Галіна СІНІЛА, кандыдат філалагічных навук, прафесар кафедры культуралогіі факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ.**

Неаднолькавае выкарыстанне рэлігійнай лексікі ў практыцы канфесій нашай краіны прывяло да таго, што сёння нават геаграфічныя назвы і асабовыя імёны падаюцца па-рознаму. Але ці на карысць такія разыходжанні літаратурнай беларускай мове? Ужо не раз падымалася пытанне аб неабходнасці стварэння адзінага для ўсіх перакладу, тым больш што Біблія старэйшая за рэлігіі і канфесіі.

«Калі б мы ўзялі нават пераклады 30-гадовай даўнасці, то казалі б аб «розных мовах», таму што там выкарыстана не толькі іншая лексіка, але і розныя арфаграфічныя і граматычныя традыцыі. Зараз мы ўжо не гаворым пра разнабой у арфаграфіі і граматыцы, усё ж набліжэнне у гэтых адносінах ідзе. Мы маем нарматыўную беларускую мову, — заўважае **кандыдат філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ірына БУДЗЬКО.** — Сёння мы гаворым толькі пра розніцу пры ўжыванні лексем, слоў. Але варыянтнасць у нейкай тэрміналагічнай групе — гэта нармальна, асабліва для моў, якія развіваюцца. Тут важная проста фіксацыя».

Трэба вырашаць і пытанне з тым, як сакральную лексіку падаваць у сучасных лексікаграфічных выданнях. Напрыклад, зараз вядзецца работа над вялікім тлумачальным слоўнікам беларускай мовы. Вучоныя Інстытута мовазнаўства прапанавалі падаваць у ім розныя варыянты з перакладаў біблійных тэкстаў, але пры гэтым выпрацаваць сістэму памет (накшталт «праваслаўнае», «каталіцкае», «пратэстанцкае»), каб было бачна, якая форма ўжываецца ў царкве, а якая ў касцёле.

«Пераклад Слова Божага, які не прызначаны для выкарыстання ў храме, нельга лічыць паўнавартасным у місійным прызначэнні», — упэўнены **доктар філалагічных навук, прафесар, член аўтарскага калектыву па перакладзе кніг Біблії на беларускую мову Іван ЧАРОТА.** Але Біблія не стане «жывой кнігай», калі яна не дойдзе да чытача па-за царквой. І тут важна, каб беларускі пераклад яе быў даступны, бо, напрыклад, яшчэ пару гадоў таму набыць Біблію на роднай мове было даволі праблематычна.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Ягена ЛЯСЕЦКАЯ
Фота слова

*Там, дзе шумны горад поўніцца*
*Навагоднімі дзівосамі,*
*Майстравалі ёлку-модніцу*
*Між стальнымі хмарачосамі.*

*Па дызайне — найсучасная,*
*І пад зоркаю каляднаю!*
*Сапраўды, ялінка класная...*
*Толькі ж бачу: несапраўдная.*

*Кожнай украсе буду рады я,*
*Але шчыра ўсім агучваю:*
*Лепш вырошчваць сапраўднае,*
*А не выштукоўваць штучнае.*



# СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «NGK – УДАЧНАЯ ПОКУПКА»

Организатором Рекламной игры является Торговое унитарное предприятие «Пропеллер Медиа», УНП 391811829, зарегистрированное администрацией Октябрьского района г. Витебска от 17 февраля 2017 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 391811829.

Юр. адрес: Республика Беларусь, 210038, г. Витебск, пр-т Московский, 55Л/3, контактный телефон +375212642244.

Срок и место проведения Рекламной игры: 12.11.2018 по 31.12.2018, по адресу: Республика Беларусь, Минск. Торговая сеть магазинов автозапчастей «ARMTEK» ООО «Еврозапчасть».

**В рекламной игре разыгрывались призы 4 видов:**

*1 приз – идентификационная электронная карта № 691672945 системы «BERLIO CARD» (на получение нефтепродуктов А-92, А-95, Дт, Газ в сети АЗС ИООО «ЛУКОЙЛ Белоруссия»;*

*4 приза – видеорегистратор (ACV GQ115 720/GP chipset Black);*

*20 призов – кружка с логотипом NGK;*

*20 призов – футболка с логотипом NGK.*

**Призовой фонд был разыгран полностью. Было разыграно:**

*1 приз – идентификационная электронная карта № 691672945 системы «BERLIO CARD» (на получение нефтепродуктов А-92, А-95, Дт, Газ в сети АЗС ИООО «ЛУКОЙЛ Белоруссия»);*

*4 приза – видеорегистратор (ACV GQ115 720/GP chipset Black);*

*20 призов – кружка с логотипом NGK;*

*20 призов – футболка с логотипом NGK.*

**Общее количество участников рекламной игры составило 382 человека.**

Правила проведения Рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 217 от 10.11.2018 года. По вопросам рекламной игры обращаться по телефону +375445046404 с 10.00 до 18.00 в рабочие дни по 31 декабря 2018 г. Рекламная игра «NGK – Удачная покупка» зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, свидетельство о государственной регистрации № 3417 09.11.2018 г.

**Список победителей:**

Смирнов Сергей Сергеевич – Видеорегистратор
Петух Владимир Александрович – Кружка с логотипом NGK
Смирнов Сергей Сергеевич – Кружка с логотипом NGK
Девятников Николай Евгеньевич – Кружка с логотипом NGK
Медведев Станислав Николаевич – Кружка с логотипом NGK
Медведев Станислав Николаевич – Кружка с логотипом NGK
Смирнов Сергей Сергеевич – Футболка с логотипом NGK
Смирнов Сергей Сергеевич – Футболка с логотипом NGK
Карман Александр Казимирович – Футболка с логотипом NGK
Медведев Станислав Николаевич – Футболка с логотипом NGK
Антонов Евгений Иванович – Футболка с логотипом NGK
Дашкевич Сергей Васильевич – Видеорегистратор
Коренчук Алексей Александрович – Кружка с логотипом NGK
Коренчук Алексей Александрович – Кружка с логотипом NGK
Турко Алексей Николаевич – Кружка с логотипом NGK
Смирнов Сергей Сергеевич – Кружка с логотипом NGK
Смирнов Сергей Сергеевич – Кружка с логотипом NGK
Долгий Денис Валерьевич – Футболка с логотипом NGK
Мацуков Кирилл Викторович – Футболка с логотипом NGK
Медведев Станислав Николаевич – Футболка с логотипом NGK
Иванов Сергей Александрович – Футболка с логотипом NGK
Михно Дмитрий Геннадьевич – Футболка с логотипом NGK
Туз Владимир Олегович – Видеорегистратор
Казак Евгений Григорьевич – Кружка с логотипом NGK
Синкевич Александр Александрович – Кружка с логотипом NGK
Терешкович Андрей Владимирович – Кружка с логотипом NGK
Герасим Ирина Ивановна – Кружка с логотипом NGK
Смирнов Сергей Сергеевич – Кружка с логотипом NGK
Синица Александр Генрихович – Футболка с логотипом NGK
Гирин Юрий Робертович – Футболка с логотипом NGK
Петроченко Петр Иванович – Футболка с логотипом NGK
Хлебников Александр Александрович – Футболка с логотипом NGK
Смирнов Сергей Сергеевич – Футболка с логотипом NGK
Крылов Николай Геннадьевич – Видеорегистратор
Баранов Павел Васильевич – Кружка с логотипом NGK
Семенов Андрей Сергеевич – Кружка с логотипом NGK
Навойчик Владимир Иосифович – Кружка с логотипом NGK
Смирнов Сергей Сергеевич – Кружка с логотипом NGK
Смирнова Мария Сергеевна – Кружка с логотипом NGK
Вишневский Александр Александрович – Футболка с логотипом NGK
Нестерчук Алексей Сергеевич – Футболка с логотипом NGK
Манько Дмитрий Николаевич – Футболка с логотипом NGK
Смирнова Мария Сергеевна – Футболка с логотипом NGK
Буденков Дмитрий Анатольевич – Футболка с логотипом NGK
Субель Павел Станиславович – Идентификационная электронная карта № 691672945 системы BERLIO CARD (на получение нефтепродуктов А-92, А-95, Дт, Газ в сети АЗС ИООО «ЛУКОЙЛ Белоруссия»).

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белхим» (продавец)**

Лот № 1. Здание административно-бытового корпуса с инв. № 620/С-840, 1975 г. п. Адрес: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25. Назначение: здание административно-хозяйственное. Этажность – 3. Площадь – 2 132,7 кв. м. Составные части и принадлежности: целое трехэтажное здание административно-бытового корпуса из железобетонных стеновых панелей (БЗ/п). **Начальная цена** с НДС – 384 480,00 бел. руб. **Задаток** – 50 000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %.

**Обременение:** ипотека. В случае продажи с публичных торгов имущества, являющегося предметом ипотеки, ипотека прекращается в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Земельный участок** площадью 0,3278 га, кадастровый номер 622250600001002017. Целевое назначение: для обслуживания здания административно-бытового корпуса. Право постоянного пользования. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В, площадь 0,0270 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Аукцион состоится **10.01.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Белхим», проводимом **10.01.2019**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений **08.01.2019** в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.03.2018. Контактное лицо для осмотра Объекта – Диденко Дмитрий Алексеевич, тел. +375-44-581-89-49

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**В информационное извещение о проведении 23 января 2019 г. аукциона по продаже права заключения договоров аренды площадей, находящихся в собственности ОАО «КРИСТАЛЛ-МАГ» г. Барановичи», опубликованном 08.12.2018 г., № 237 внести изменения** – п. 1 читать – аукцион состоится 23 января 2019 г.; п. 11 читать – заявления на участие в аукционе принимаются по 22 января 2019 г. включительно.

УНП 200168503

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «XISTORE TRAVEL (ТРЕВЕЛ)»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Xistore travel (тревел)» (далее – Правила), направленной на продвижение продукции, производимой под торговыми марками «Mi», «Xiaomi», реализуемой в магазинах торговой сети «Xistore» находящихся на территории Республики Беларусь, а также через интернет-магазин xistore.by, разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Xistore travel (тревел)» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

